

ЯК ПЕРАЖЫЦЬ МАГНІТНЫЯ БУРЫ? 5



ЧЫМ МОЖА ГАНАРЫЦЦА БЕЛАРУСКАЯ ОПЕРА? 6



5 ЧЭРВЕНЯ 2021 г.

СУБОТА

№ 105 (29474)

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА


З першых вуснаў

## «Мы вельмі лёгка аддаём свае рынкі для іншых»



Фота БелТА.

### Ці патрэбен Мікашэвічам яшчэ адзін горна-абагачальны камбінат і чаму ў калектыўнага Захаду «гранітнае сэрца» — Прэзідэнт наведаў прадпрыемства «Граніт» у Лунінецкім раёне

**Прадпрыемства «Граніт» — сапраўдная душа Мікашэвічаў, дзякуючы яму пасёлак у 2005 годзе атрымаў статус горада раённага падпарадкавання і развівае сваю сацыяльную сферу. Так, пабудаваныя некалькі дзясяткаў шматкватэрных жылых дамоў для супрацоўнікаў, два дзіцячыя садкі, бальніца, паліклініка, Палац культуры, санаторый «Світанак» і басейн.**

#### ПРА НАДЗЁННАЕ РЭГІЁНА І ПРАДПРЫЕМСТВА

Па традыцыі пасля прыбыцця ў рэгіён спачатку Прэзідэнт удзяляе ўвагу пытанням яго сацыяльна-эканамічнага развіцця і надзённым праблемам. Прэзідэнт запытаў у Юрыя Шулейкі, што насцярожвае губернатара ў сувязі з агрэсіўнай палітыкай калектыўнага Захаду? Старшыня аблвыканкама адзначае: крыху «заціхарыліся» прадпрымальныя брастчане, што ездзілі ў Польшчу, Украіну. Яны засталіся фактычна без працы, даходы падаюць. «Іх неабходна чуць, слухаць і размаўляць. Гэта нашы людзі, і там, дзе мы можам, падтрымаем, дапаможам. Але трэба пачынаць працаваць і не трэба думаць, што заўтра Захад іх прыме», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

#### ЧЫМ ЖЫВЕ «ГРАНІТ»?

Падчас наведвання прадпрыемства «Граніт» Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў узяць на кантроль сітуацыю з працай на знешніх рынках. Па словах генеральнага дырэктара «Граніту» Эдуарда Гаўрылковіча, экспарт прадпрыемства па прычыне закрыцця межаў у пандэмію прыкметна знізіўся. Складанасці дадаюць меры нетарыфнага рэгулявання ў Расіі, якія абмяжоўваюць аб'ёмы ўвозу беларускай сыравіны.

«Неадкладна давесці прэм'ер-міністру гэтае пытанне, каб мы маглі прасоўвацца. Разбірайце з кіраўніцтвам завода тут. Што ўвесь час спіхваць праблемы наверх? Трэба і тут варушыцца», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Наконт рэалізацыі інвестыцыйнага праекта па будаўніцтве горна-абагачальнага камбіната «Граніт» ён не ўпэўнены, што новы завод запатрабаваны: шчэбень, што дабываюць на «Сітніцкім», можна перапрацоўваць на існуючых магутнасцях. Гэта пытанне яшчэ неабходна дасканала пралічыць. «Вызначайцеся, што будзем рабіць», — сказаў Прэзідэнт.

Чыноўнікі прапаноўваюць прадпрыемству не спадзявацца на ўнутраны рынак, а шукаць пакупнікоў за межамі.

«Трэба браць на кантроль гэта ва ўрадзе. Дзе магчыма, неабходна дапамагаць, а дзесьці трэба і прымушаць. Не варта спадзявацца на тое, што міністр заўтра ўсе праблемы вырашыць. Мы казалі, што хтосьці больш эфектыўна павінен працаваць «наверсе», але і кіраўнікі павінны варушыцца», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

#### БЕСПІЛОТНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ

Прэзідэнту таксама расказалі пра новыя тэхналогіі здабычы гранітнага шчэбеню і работу айчыннай беспілотнай тэхнікі на радовішчы «Сітніцкае». Кіраўніка дзяржавы праінфармавалі аб рэалізацыі праекта «Інтэлектуальны кар'ер. Бязлюдная тэхналогія здабычы на радовішчы «Сітніцкае» з выкарыстаннем тэхналогіі перадачы даных па каналах сувязі 5G.

Праект выконваецца сумесна з іншымі прадпрыемствамі. Самае галоўнае, як далажылі спецыялісты, што кошт такіх распрацовак невялікі, але асноўнае — інтэлектуальныя кампетэнцыі. Стварылі праграмнае забеспячэнне для тэхнікі айчынныя айцішнікі.

Аляксандр Лукашэнка застаўся задаволены работай інжынераў. Ён адзначыў, што прамысловыя прадпрыемствы і навукоўцы не горшыя за айцішнікаў. На думку кіраўніка краіны, верагодна, іх стымулюе канкурэнцыя. «Яны працуюць, ствараюць гатовы прадукт. Не проста праграмнае забеспячэнне ў Амерыку аддаюць, а ствараюць тое, што нам сёння трэба», — падкрэсліў ён.

Плануецца, што прымяненне бязлюднай тэхналогіі здабычы дазволіць нарасціць прадукцыйнасць на 30 працэнтаў, павялічыць каэфіцыент тэхнічнай гатоўнасці за кошт змяншэння прастояў, эканоміі на рамонце тэхнікі за кошт аптымальных рэжымаў работы. Акрамя таго, прымяненне такога транспарту дасць магчымасць знізіць траўматызм работнікаў.

**Пасля знаёмства з новымі тэхнічнымі распрацоўкамі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з калектывам прадпрыемства «Граніт» і адказаў на актуальныя пытанні пра дзейнасць завода і жыццё раёна.**

#### СВАЁ — ЛЕПШАЕ, ЧЫМ ІМПАРТНАЕ

Прэзідэнт у размове адзначыў, што асноўная прычына яго прыезду на «Граніт» — даведацца, як ідуць справы па будаўніцтве горна-абагачальнага камбіната на базе радовішча «Сітніцкае». Па яго словах, «пакуль там разгарнуліся не вельмі», бо цяжка рэалізаваць аб'ёмы прадукцыі, якую дабываюць на ўжо распрацаваных месцараджэннях.

СТАР. 2



## КУПАЛЛЕ Ў СТЫЛІ БЕЛАРУСКАГА РУЧНІКА

### Чым будзе здзіўляць гэтым разам рэспубліканскае купальскае свята «Александрыя збірае сяброў»

**Крыху болей чым месяц застаецца да гэтай прыгожай падзеі з народным паходжаннем. Авеянае таямніцамі і легендамі, чаканнем нечага хвалюючага і абавязкова прыемнага, Купалле не перастае здзіўляць і радаваць. І адзначаць яго ўсёй нашай краінай у Шклоўскім раёне ў маляўнічым запаветным куточку на беразе Дняпра, на мяжы Магілёўскай і Віцебскай абласцей, стала ўжо добрай традыцыяй. Бо што можа быць лепей, чым сабрацца ў самы разгар лета вялікай дружнай сям'ёй на стракатым ад разнатраўя купальскім лузе, паназіраць за гульнямі гарэзлівых матылькоў, паслухаць спевы галасістых птушак? А разам з тым пасмакаваць беларускія стравы, замілавацца народнымі спевамі і танцамі, павадзіць карагод, прымераць купальскі вяночак.**

Аргкамітэт па падрыхтоўцы і правядзенні свята «Купалле» («Александрыя збірае сяброў») паклапаціўся стварыць для гэтага ўсе ўмовы. На гэтым тыдні ў Александрыі прайшло яго чарговае пасяджэнне, у якім прынялі ўдзел намеснік прэм'ер-міністра Ігар Петрышэнка, міністры культуры Анатоль Маркевіч і інфармацыі Уладзімір Пярцоў. Была яшчэ раз прааналізавана падрыхтоўчая работа і дадзена ацэнка ступені гатоўнасці свята па ўсіх кірунках.

Сёлета, улічваючы складаную эпідэміялагічную абстаноўку, фестываль будзе доўжыцца ўсяго адзін дзень замест двух — 10 ліпеня. Намеснік прэм'ер-міністра звярнуў увагу на стварэнне і выкананне ўсіх неабходных санітарна-эпідэмічных умоў, якія актуальныя падчас пандэміі. Што датычыцца праграмы і месца дзеяння, то тут таксама ўсё павінна быць адшліфавана і даведзена да дасканаласці. Мясцовыя ўлады і Магілёўскі аблвыканкам папярэджаны аб неабходнасці прымаць аператыўныя рашэнні ў арганізацыі маштабнага фестывалю.

— Гэта свята — брэнд для ўсёй краіны, — падкрэсліў важнасць мерапрыемства **Ігар ПЕТРЫШЭНКА.** — Засталося зусім мала часу да яго пачатку, і вельмі важна яшчэ раз прапрацаваць усе пытанні. Трэба дадаць навізны ў фестывальную праграму, захоўваючы пры гэтым яе нацыянальны каларыт.

Праграма фестывалю абяцае быць як заўсёды насычанай і разнастайнай. Акрамя традыцыйных пляцовак, якія карыстаюцца папулярнасцю ў гасцей — «Свята кнігі», «Кірмашовых забаў», рэспубліканскага сямейнага сельскагаспадарчага праекта «Уладар вёскі», дзе традыцыйна выбіраюць найлепшую сельскую сям'ю Беларусі, будуць і навінкі. Сярод іх — незвычайны канцэрт-караоке.

СТАР. 3

## Круціся, кола!



Тры гады працуе ў шынамантажы ў горадзе аўтабудаўнікоў Жодзіне Павел СІЛІЧ. Увішны, ведае сваю справу дасканала, як кажуць, моцны і ўмелы спецыяліст. У брыгадзе рамонтнікаў гума-тэхнічных вырабаў — так цяпер называецца гэтая рабочая пасада — Павел самы малады, тым не менш не саступае старэйшым і больш вопытным калегам. У горадзе задзейнічана каля дзесяці майстэрань па «абуванні» жалезных коней, а фірма, у якой шчыруе Павел, на слыху ў кожнага аўтаўладальніка. Мне часам даводзіцца паркавацца на вядомай пляцоўцы, мяняць зімовую «гуму» на летную і наадварот, латаць праколы. Стараюся трапіць у майстравыя рукі Сіліча, бо ведаю, што ён з усёй душою паставіцца да маіх калёсных праблем і дасць слушныя парады. У яго заўсёды пазітыўны настрой і прыветная ўсмешка, хоць праца яго — не з лёгкіх.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### IATA заклікае Еўропу адмяніць забарону на палёты над Беларуссю



Міжнародная асацыяцыя паветранага транспарту (IATA) лічыць, што дырэктыва Еўрапейскага агенцтва па авіяцыйнай бяспецы па бяспецы палётаў у паветранай прасторы Беларусі з'яўляецца цалкам палітызаванай. Адпаведнае паведамленне апублікавана ў пятніцу на сайце IATA, паведамляе ТАСС.

IATA заклікае да правядзення незалежнага расследавання ў сувязі з інцыдэнтам Ryanair. «Палітыка ніколі не павінна ўмешвацца ў бяспечную эксплуатацыю самалётаў, а палітыкі не павінны выкарыстоўваць авіяцыйную бяспеку як прыкрыццё для дасягнення палітычных ці дыпламатычных мэт», — прыводзяцца ў дакуменце словы генеральнага дырэктара IATA Вілі Уолша.

### Сусветныя цэны на прадукты харчавання дасягнулі рэкордных паказчыкаў за 10 гадоў

Рост сусветных цэн на прадукты харчавання ў маі 2021 года стаў рэкордным за апошнія 10 гадоў. Такія даныя прыводзіць Харчовая і сельскагаспадарчая арганізацыя ААН (ФАО), паведамляецца на сайце Цэнтра навін ААН.

Сярэдняе значэнне Індэкса харчовых цэн ФАО за май на 4,8 % вышэйшае за красавіцкі паказчык і на 39,7 % вышэйшае за паказчык мая 2020 года. Адной з галоўных прычын такога росту стаў рэзкі ўздым сусветных цэн на алей, цукар і збожжавыя. Ён дасягнуў найвышэйшага значэння з верасня 2011 года. Галоўным фактарам павышэння цэн на збожжавыя стала падаражанне кукурузы: сярэдняе значэнне цэн перавысіла паказчык мінулага года на 89,9 %. Майскія цэны на пшаніцу былі на 6,8 % вышэйшыя за красавіцкія. Падаражэў і цукар — на 6,9 %. Прычынамі сталі затрымкі ўборачнай кампаніі і чаканне нізкіх ураджаяў у Бразіліі — найбуйнейшым у свеце экспарцёры цукру. Цэны на мяса ў маі выраслі на 2,2 % галоўным чынам з-за павелічэння імпарту ў Кітай, а таксама росту ўнутранага попыту на мяса птушкі і свініну ў вядучых рэгіёнах-вытворцах.


ISSN 1990 - 763X

21105>

9 771990 763008


### ЗША ўсумніліся ў іншапланетным паходжанні НЛА

У Злучаных Штатах усумніліся ў іншапланетным паходжанні неапазнаных лятальных аб'ектаў, якія назіралі амерыканскія лётчыкі ў апошнія гады. Пра гэта паведамляе газета The New York Times са спасылкай на высокапастаўленых чыноўнікаў, якія азнаёміліся з урадавым дакладам па тэме.

Амерыканская разведсупольнасць не знайшла доказаў таго, што гэтыя аб'екты і скарыстаныя імі тэхналогіі насілі іншапланетны характар. Аўтары даклада таксама паведамілі, што большая частка са 120 падобнымі інцыдэнтамі не была звязана з амерыканскімі перадавымі тэхналогіямі. Тым самым была выключана версія пра тое, што лётчыкі маглі ўбачыць выпрабаванні нейкіх сакрэтных распрацовак урада.

У той жа час крыніцы выдання адзначаюць, што прадстаўленыя ў дакладзе высновы ўсё роўна цалкам не выключаюць тэорыю аб тым, што заўважаныя ваеннымі з'явы могуць быць касмічнымі караблямі прышэльцаў. Па іх словах, аўтары дакумента прызнаюць, што ім складана растлумачыць шэраг рэчаў: напрыклад, паскарэнне аб'ектаў і іх здольнасць імкліва мяняць напрамак і апускацца ў ваду. Амерыканская разведка таксама засумнявалася ў версіі аб метэаралагічным характары падобных з'яў. Незасакрэчаная версія даклада будзе прадстаўлена Кангрэсу ЗША да 25 чэрвеня.

## КОРАТКА

- **Унікальны перасоўны музей «Цягнік Перамогі» прыбудзе ў Беларусь 11 чэрвеня.**
- «Белавія» пачынае лётаць у Шарамецьцева і павялічвае частату рэйсаў у Стамбул, Тбілісі і Батумі.
- **МТЗ падпісаў пагадненне аб пастаўках і зборцы трактароў у Індыі.**
- Новы цягнік Гомель — Масква будзе курсіраваць штодня з 10 чэрвеня.
- **Францыя з 9 чэрвеня дазволіла ўезд вакцынаваным грамадзянам ЕС без ПЦР-тэсту.**
- Беларусы заваявалі «золата» і «бронзу» чэмпіянату Еўропы па веславанні на байдарках і каноэ ў Польшчы.

Размова па сутнасці

## На вастрыні праўды і аб'ектыўнасці

### Прэс-сакратары сілавых ведамстваў — аб пытаннях інфармацыйнай рэчаіснасці

**Інфармацыйная вайна на нашым медыйным полі вядзецца ўжо не першы год — гэты факт трэба прызнаць. Асабліва востра, часта беспадстаўна, аўдыторыя чамусьці рэагуе на падзеі, якія адбываюцца ў сілавых структурах. Як працаваць у гэтых складаных умовах, якіх стратэгій прытрымлівацца на інфармацыйным полі бою, якім чынам узаемадзейнічаць сілавікам з журналістамі — пра гэта, а таксама пра шмат што іншае за круглым сталом на тэму «Інфармацыйнае супрацьстаянне сучасным выклікам і пагрозам: узаемадзеянне прэс-службаў сілавых структур і СМІ ў новых рэаліях», які адбыўся ў рэдакцыі газеты «Звязда», пагаварылі з медыйнымі экспертамі, якія ў сваіх сілавых ведамствах адказваюць за СМІ і сувязі з грамадскасцю.**

СТАР. 2


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# «Мы вельмі лёгка аддаём свае рынкі для іншых»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Вы залежыце ад будаўніцтва — дарожнага, дамоў, вытворчых памяшканняў. Калі згортваецца будаўніцтва, то складана і вам, — ваша прадукцыя менш запатрабавана», — адзначыў кіраўнік краіны.

Аляксандр Лукашэнка дадаў, што існуюць меркаванні аб незапатрабаванасці новага завода, бо перапрацоўваць прадукцыю могуць і на існуючым. «Перш за ўсё неабходна рэалізаваць тое, што вы сёння ствараеце. Праблема заключаецца ў тым, што дзесьці з Расіяй не спрацавалі. Зразумела, яны будуць захоўваць свой рынак. У іх таксама закрываліся вытворчасці, і будаўніцтва ўпала (з-за пандэміі. — **«Зв.»**). Ім неабходна свой шчэбень спажываць і іншыя матэрыялы», — сказаў Прэзідэнт.

На яго думку, праблемы несур'ёзныя — неабходна пакрысе дабаўляць у экспарце ў Расію.

«Але ёсць яшчэ адна праблема — унутраны рынак. Мы вельмі лёгка аддаём свае рынкі для іншых. Зараз гэта ўжо няважна, але ў мінулым годзе мы пэўную колькасць прадукцыі завезлі з Украіны. Яны бар'еры нам выбудоўваюць, пачынаючы з паветра, заканчваючы іншымі таварамі, якія мы імкнёмся туды прадаць, а мы «растапырыліся»: давайце, вязіце! Ёсць шэраг дробных праблем, якія мы добра ведаем і вырашым у найбліжэйшы час», — падкрэсліў кіраўнік краіны.

Ён заўважыў: у мінулым годзе былі добрыя паказчыкі і буйны рост у прамыслоўцаў.

«Усе з-за пандэміі пазакрываліся, а мы працавалі, як бы ні было цяжка. Настаў час, калі запасы скончыліся, але людзям жыць трэба. І, пачынаючы ад халадзільнікаў, пральных машын да вашых матэрыялаў, з'явілася вялікая запатрабаванасць у прадукцыі, што ствараем у Беларусі. Вось прамысловасць і пачала расці», — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка і заявіў, што турбуецца пра тое, каб такія тэмпы захаваліся і ў наступныя гады.

## ЗВЫЧАЙНАЯ КАНКУРЭНЦЫЯ

Кіраўнік краіны расказаў аб прычынах «накатаў» на Беларусь з боку іншых краін.

«Накат пайшоў на Расію, а праз нас жа не пераскочыш. Ды і Украінай мы не можам стаць і ваяваць супраць Расіі. Рускія — нашы людзі, мы такія ж, як яны, таму і ідзе гэты накат», — абазначыў першую прычыну Прэзідэнт.

Другая, па яго словах, — канкурэнцыя ў эканоміцы.

«Свет у мінулым годзе сціснуўся на фоне ковіду, і месца ўсім не хапае. Таму трэба выстаяць, чаго б гэта ні каштавала, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Проста не будзе. Гэта звычайная канкурэнцыя. Навошта вы на рынку, калі Украіна можа ў два разы больш стварыць і прадаць? І Расія можа стварыць і прадаць. І гэтак далей. Такой вытворчасці ў свеце хапае».

Ён патлумачыў, чаму аб'явілі санкцыі і кампаніі «Белавія».

«Іх спрабуюць пакараць ні за што. Чаму? Таму што дзяржаўная кампанія, не прыватная, а працуе лепш, чым любая кампанія ў свеце. Як так можа быць: нейкая там Беларусь — лепшая?! Ёсць шэраг іншых прычын, але гэта галоўнае — канкурэнцыя. Трэба прыбраць канкурэнта, будуць самі перавозіць людзей. «Lufthansa», «Ryanair» і іншыя — яны ж змагаюцца за рынак пасля гэтай хваробы. Галоўнае — канкурэнцыя, а ўсё астатняе потым — і дыктатар, Прэзідэнт не той», — выказаў меркаванне кіраўнік краіны.

Па яго словах, грамадству шмат расказваюць пра тое, што адбываецца ва ўнутранай і знешняй палітыцы краіны. Робяць гэта для таго, каб людзі зразумелі, што хацелі зрабіць з краінай у сярэдзіне мінулага года.

## «МЫ Ў АДНОЙ ЛОДЦЫ З ІМІ»

Адна з супрацоўніц звярнулася да Прэзідэнта з праблемай штучнага, на думку работнікаў прадпрыемства, абмежавання з боку расійскіх партнёраў перавозак шчэбеню чыгуначным транспартам і папрасіла дапамагчы з вырашэннем пытання.

«Ураду я даручыў, каб імгненна звязаліся з расіянамі. Паспрабуем тут вам дапамагчы. Магчыма, не адразу зробім тое, што вы хочаце, але абавязкова паспрабуем вам дапамагчы. Ёсць да гэтага тэндэнцыі зараз у адносінах з Расійскай Федэрацыяй: і яны, і мы апынуліся ў няпростай сітуацыі, бо ўсе нас хочуць прыціснуць. Нас, я вам сказаў, па якой прычыне, іх — каб Расія, ядзерная дзяржава, не падняла галаву. Таму мы ў адной лодцы з імі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён нагадаў, што добры партнёр, Кітай, ёсць на ўсходзе. «Бяздонны там рынак. Я і дырэктару вашаму сказаў, што неабходна варушыцца. Неяк мы спрабавалі крыху ў Кітай прадаць гэты шчэбень — дарога пратаптана. Трэба па гэтай дарозе рухацца. Гэтаксама і ў іншыя краіны», — сказаў Прэзідэнт.

Ён паабяцаў дапамагчы павялічыць пастаўкі на ўсіх напрамках, але заявіў, што ўсё залежыць ад самога прадпрыемства.

## «ЗАКОНЧУ ГЭТУЮ ДАРОГУ — І НА ПЕНСІЮ ПАЙДУ»

Яшчэ адно пытанне ад працоўных «Граніту» — рэканструкцыя дарогі М10 «Кобрын — Гомель». Прэзідэнт адзначыў, што некалі гэта была яго ініцыятыва, але справа рухаецца вельмі марудна. Ён даў загад намесніку кіраўніка сваёй Адміністрацыі Дзмітрыю Крутому ўважліва заняцца гэтым пытаннем і хутчэй рэалізоўваць праект. Па словах Прэзідэнта, на ўчастку ад Рэчыцы да Калінкавічаў ужо пачалі работу. «Закончу гэтую дарогу — і на пенсію пайду. Хачу, каб гэтая дарога была пабудавана. Гэта важна для нас і таму, што мы перахопім патокі з Украіны. Раней па Украіне ішлі патокі, а мы перахопім паўднёвыя напрамкі з Расіі і як па (трасе. — **«Зв.»**) Брэст — Масква перакінем туды на захад. Гэта добрыя грошы», — сказаў кіраўнік краіны.

Ён запэўніў: чаго б гэта ні каштавала, дарогу пабудуюць, і яна будзе лепшая, чым траса Брэст — Масква.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# ЗА СЛУЖБУ РАДЗІМЕ

### Міністр абароны ўзнагародзіў найлепшых ваеннаслужачых 38-й брыгады



**Міністр абароны Беларусі Віктар ХРЭНІН узнагародзіў ваеннаслужачых 38-й асобнай дэсантна-штурмавой брыгады па выніках інспектарскай праверкі, якая праводзілася ў злучэнні ў красавіку — маі гэтага года.**

На працягу двух тыдняў брыгада здавала сур'ёзны экзамен па баявой падрыхтоўцы. Гвардзейцы-дэсантнікі паказалі выдатныя вынікі па ўсіх прадметах, высокі ўзровень майстэрства, вывучкі, навыкаў.

За высокі прафесіяналізм чарговыя воінскія званні прысвоены шэрагу афіцэраў брыгады датэрмінова. Пагоны ім уручылі ва ўрачыстай абстаноўцы ў прысутнасці ўсяго асабовага складу. Многія дэсантнікі ў гэты дзень атрымалі граматы, падзякі, каштоўныя падарункі.

Віктар Хрэнін падкрэсліў, што 38-я брыгада з'яўляецца флагманам баявой падрыхтоўкі ва ўсіх Узброеных Сілах краіны. І вынікі праверкі — таму сведчанне.

Сёння 38-я Брэсцкая асобная гвардзейская дэсантна-штурмавая брыгада — высокамабільнае злучэнне, аснашчанае сучаснай зброяй і ваеннай тэхнікай, адна з найлепшых часцей беларускай арміі. Дэсантнікі большую частку сваёй службы праводзяць на палігонах і палявых выхадах, у тым ліку міжнародных, дастойна прадстаўляюць сваю краіну за яе межамі. У другой палове гэтага года брыгада ў поўным складзе прыме ўдзел у вучэннях «Захад-2021», якія пройдуць на Брэсцкім палігоне.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# НА ВАСТРЫНІ ПРАЎДЫ І АБ'ЕКТЫЎНАСЦІ

**Вострыя пытанні сённяшняй інфармацыйнай рэчаіснасці абмеркавалі афіцыйны прадстаўнік Міністэрства абароны Наталля ГАЎРУСІК, начальнік аддзела інфармацыі і сувязі з грамадскасцю цэнтральнага апарату Следчага камітэта Сяргей КАБАКОВІЧ, памочнік міністра — прэс-сакратар Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Віталь НАВІЦКІ, начальнік упраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў — прэс-сакратар Міністэрства ўнутраных спраў Вольга ЧАМАДАНАВА.**



Сяргей КАБАКОВІЧ.



Вольга ЧАМАДАНАВА.



Віталь НАВІЦКІ.



Наталля ГАЎРУСІК.

## АПЕРАТЫЎНА — НЕ ЗАЎСЁДЫ АБ'ЕКТЫЎНА

**Віталь НАВІЦКІ:** — У пэўнай колькасці людзей памянялася свядомасць, змяніліся некаторыя тэхналагічныя рэчы, аднак глабальна ў прынцыпах і падыходах ва ўзаемадзеянні са СМІ, калі казаць пра прэс-службу нашага ведамства, кардынальных змен не адбылося. Як заўсёды, мы даём аператыўную, дакладную інфармацыю аб дзейнасці дзяржаўнага органа, якая распаўсюджваецца на тых каналах і пляцоўках, якія ўжо існуюць. Як раней стаяла праблема, што рабіць з чуткамі (тады непраўдзівая інфармацыя называлася менавіта так), ёсць яна і цяпер: толькі ўся псеўдаінфармацыя стала фэйкам. Як была негатыўна настроеная частка грамадства актыўнай у сацыяльных сетках, так яна і засталася. Адзінае, у чым бачу істотныя змены: усё больш людзей, якія займаюць дзяржаўную пазіцыю, прыходзяць у той самы Facebook, які ў прынцыпе лічыўся пляцоўкай, дзе збіраюцца толькі тыя, хто нечым незадаволены. Усё часцей там з'яўляюцца людзі, частка якіх па пэўных прычынах не хоча афішыраваць месца сваёй працы, але па запісах, аватарках і каментарыях відаць, што яны займаюць канструктыўную пазітыўную пазіцыю, што не можа не радаваць.

**Сяргей КАБАКОВІЧ:** — Сапраўды, у інфармацыйным полі стала вельмі заўважная прысутнасць людзей, якія хочуць данесці сваю думку аб тым, што яны падтрымліваюць дзяржаўную палітыку ў цяперашніх умовах, падтрымліваюць Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Раней мы прызвычаіліся да таго, што ў інтэрнэт-прасторы знаходзілася актыўная меншасць, якая пастаянна была нечым незадаволеная, і мы змагаліся з недастатковай свядомасцю таго, што яны робяць. Безгалосых шмат, вельмі мала актыўных людзей, якія не баяцца гаварыць. Цяпер сітуацыя мяняецца.

**Вольга ЧАМАДАНАВА:** — Калі вярнуцца яшчэ ў 2018-ы, 2019-ы гады, то трэба сказаць аб тым, што прэс-службы сілавых структур не працавалі так, як яны працуюць цяпер. Яны пастаянна рэагуюць на інфармацыйныя ўкіды і процістаяць фэйкам. Раней нават слова такога не ўжывалі: мы казалі аб тым, што гэта недакладная інфармацыя. Інтэрнэт дае нам новыя тэрміны: «пранкеры», «хейтары»... Скажыце, мы раней карысталіся такой тэрміналогіяй? На ведамасных інфармацыйных пляцоўках ніякія чуткі, а тым больш блогерскія выхадкі, якія былі і два-тры гады таму, мы не лічылі патрэбным каментаваць. Сёння няважна, хто аўтар навіны, хто гэты чалавек, які вяшчае інфармацыйную тэму дня, — мы будзем рэагаваць. Вядома, ёсць некаторыя моманты, якія можна назваць пройгрышнымі з нашага боку. Навіна распаўсюджваецца сёння не проста хутка, а імгненна. На жаль, тыя экстрэмісцкія тэлеграм-каналы, пра якія мы сёння ведаем, нярэдка першымі задаюць тон у інфармацыйным асяродку. Для нас узнікае дылема: як заявіць інфармацыю — аператыўна ці падрабязна і дакладна, але не адразу. І тут ёсць пэўны інфармацыйны вакуум, бо на некаторую інфармацыю, відавочна, мы не можам адрэагаваць хутка. Але ўсе разумеюць, што самая першая навіна — рэзанансная, яе ўспрымаюць, абмяркоўваюць. У чалавека ўжо склалася пэўная карцінка, усё астатняе мы або дапаўняем, або абвяргаем.

**Віталь НАВІЦКІ:** — 10 сакавіка 2018 года ў Гомелі адбылося крушэнне даху катка, і так атрымалася, што кіраўнік аднаго з паблікаў «УКантакце» знаходзіўся менавіта там. Ён аператыўна выклаў у інтэрнэт фотаздымкі, суправадзіў іх тэкстам. Пакуль на працягу чатырох хвілін супрацоўнікі МНС ехалі на месца здарэння, інфармацыя ўжо была змешчана ў інтэрнэце — адпаведна, без афіцыйнай версіі здарэння. Далей гэты нядобрасумленны чалавек інфармацыю, якую распаўсюджваў я, выдаваў за ўласную. Гэта да таго, што ў пагоні за аператыўнасцю абагнаць людзей з такім, мякка кажучы, непрафесійным падыходам не атрымаецца.

## РАЗУМЕННЕ — ГЭТА І ЁСЦЬ ДАВЕР

**Сяргей КАБАКОВІЧ:** — Як фарміраваць давер грамадства, а самае складанае — канкрэтнага чалавека, да пэўнага ведамства або дзяржаўнай арганізацыі? Гэта няпроста: наўрад ці можна перавыхаваць хулігана. Таму ў большай ступені трэба фарміраваць пазіцыю не даверу, а разумення грамадствам таго, што мы робім. Каму давярыцца грамадзянін, калі на яго напалі злодзеі? Вядома, чалавек патэлефануе па нумары 102. Ён, што, не будзе давяраць міліцыянеру, які прыедзе яго абараняць? Каму давераць тушыць пажар? Натуральна, Міністэрству па надзвычайных сітуацыях. Маці, выпраўляючы свайго сына ў армію, не вязе яго на Далёкі Усход, яна давярае сваё дзіця Узброеным Сілам. Калі злачынцы падманулі чалавека ў інтэрнэце, ён пойдзе ў міліцыю — і Следчы камітэт узбудзіць крымінальную справу. Давер — гэта і ёсць разуменне таго, што мы робім. Каб яго пашыраць, мы павінны прыцягваць грамадства ва ўмоўнае выкананне пэўных нашых функцый, дакладна і аператыўна інфармаваць насельніцтва аб нашай дзейнасці. І тады не будзе паўставаць пытання, як мы будзем развенчваць пэўныя фэйкі і здагадкі.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**Наталля ГАЎРУСІК:** — А чаму б і не ўспрымаць афіцыйныя сайты ведамстваў у тым ліку як крыніцу абвяржэння чутак?! Калі чалавек заходзіць на сайт і хоча паглядзець, што напісана там, а не толькі ў ананімным тэлеграм-канале, гэта ўжо поспех. Крытычнае ўспрыманне інфармацыі — гэта заўсёды выдатна. Каб зрабіць пэўныя высновы, трэба атрымаць інфармацыю з розных крыніц. Любы дарослы чалавек павінен умець адсякаць эмацыянальны фактар і ўдакладняць, што гэта за крыніца інфармацыі, на падставе чаго рабіць вывады. Гэта тое, што сёння модна называць інфармацыйнай гігіенай. У Мінабароны мы шмат прыкладаем намаганняў для таго, каб кожны грамадзянін быў зацікаўлены перш-наперш пачуць афіцыйную версію любога працэсу ці здарэння, каб паміж «інфармацыйным фастфудам» і фактамі ён выбраў апошняе. Гэта важны складнік інфармацыйнай бяспекі.

**Вольга ЧАМАДАНАВА:** — На ступень даверу грамадства да сілавых структур, безумоўна, уплывае час. Сёння ён складаны. Калі мы вернемся на дзесяць гадоў таму, гэта была адна ступень даверу, цяпер яна іншая. Я лічу, што прыйшоў час градацыі даверу ў дачыненні да службы міліцыянера, вайскоўца, любога сілавіка. Іншае пытанне — давер у інфармацыйнай прасторы. Хтосьці, магчыма, ніколі і не звернецца па дапамогу ў сілавыя структуры, але гэты чалавек з малых гадоў ведае, што міліцыя вызначае злачынцаў і адказвае за правапарадак, супрацоўнікі МНС ратуюць людзей, Міністэрства абароны знаходзіцца на варце нацыянальнай бяспекі. У чалавека ўжо сфарміраваны пэўныя адносіны да кожнай са структур — адпаведна, ёсць і пэўны давер. Бандыт, які ведае, што яму пагражае расплата, не сумняваецца ў праваахоўных органах: міліцыянер збярэ ўсе доказы яго віны, а Следчы камітэт узбудзіць крымінальную справу, будзе вынесены прысуд — у выніку яго чакае пэўная мера пакарання. У цэлым мы не страцілі тую функцыю, калі насельніцтва звяртаецца па дапамогу ў праваахоўныя органы. Гэта было, ёсць і будзе: людзі заўсёды патэлефануюць у міліцыю, МНС — туды, дзе яны могуць разлічваць на пэўную прававую абарону.

## ЗА НЯПРАЎДУ І ПАКЛЁП — АДКАЗНАСЦЬ

**Вольга ЧАМАДАНАВА:** — Усюды, дзе я бываю, сустракаюся з моладдзю: у школах, ва ўніверсітэтах. І ўсім задаю на сваіх сустрэчах пытанне: хто сёння ўключае тэлевізар? На нядаўняй сустрэчы, якая адбылася ў адной з ВНУ, больш чым са ста студэнтаў паднялі руку толькі некалькі чалавек.

**Сяргей КАБАКОВІЧ:** — Тым больш яны не чытаюць газет. Гэтае слова для падлетка ўвогуле малазнаёмае.

**Вольга ЧАМАДАНАВА:** — Вядома, што для сучаснай моладзі асноўная крыніца інфармацыі — гэта сацыяльныя сеткі. «Інстаграм» — самая распаўсюджаная сярод іх пляцоўка, у першую чаргу дыялогавая, дзе яны могуць пакінуць меркаванні, выказаць думкі. І ў тых, хто спажывае інфармацыю выключна з месенджараў і сацыяльных сетак, я заўсёды пытаюся, ці ўпэўнены яны, што гэтая крыніца тую ці іншую навіну выкладае праўдзіва. А навошта напружвацца і шукаць афіцыйныя акаўнты ведамстваў, каб даведвацца, што там было ў выніку?

**Сяргей КАБАКОВІЧ:** — Іх не цікавіць: праўда гэта ці няпраўда. Сучасную моладзь прыцягвае толькі карцінка таго, што адбылося. Калі, напрыклад, гэта ДТЗ, то іх цікавіць відэа, на якім зафіксаваны момант сутыкнення. Што далей будзе адбывацца: як працуюць міліцыянеры, следчыя, — многім проста ўсё роўна.

**Вольга ЧАМАДАНАВА:** — Сёння мы павінны рэагаваць абсалютна на любую навіну, якая датычыцца ведамства. І няважна, з якога месенджара або сацыяльнай сеткі яна прагучала. Раз навіна мае ўласцівасць распаўсюджвацца, у любым выпадку павінен у дачыненні да яе прагучаць каментарый: як мінімум пацвердзіць або абвергнуць, дадаць новую інфармацыю. Той час, калі тую ці іншую інфанагоду мы маглі пакінуць без увагі, варта забыць. Я вельмі добра памятаю, калі ў 2019 годзе прыйшла на сваю пасаду, той жа вядомы экстрэмісцкі тэлеграм-канал штодзённа ажыццяўляў інфармацыйныя ўкіды на міліцыянераў: даходзіла да таго, у якім адзенні яны прыходзілі на работу. Мы тады маўчалі, а нельга было! Трэба было адказваць той жа зброяй і абараняць кожнага міліцыянера, калі ён сапраўды варты гэтай абароны.

**Сяргей КАБАКОВІЧ:** — Людзі, якія пішуць негатыўную інфармацыю аб чалавеку, у тым ліку абвінавачваюць аўтараў афіцыйных каментарыяў, чамусьці думаюць, што застануцца незаўважанымі. Як у выпадку з самалётам, калі ў адрас загінулых лётчыкаў пасыпаліся абразы. Гэтыя людзі былі аператыўна ўстаноўлены супрацоўнікамі міліцыі. Паклёп — гэта адміністрацыйная адказнасць. Паклёп у адносінах да службовай асобы — крымінальна пакаральнае дзеянне. Чаму не карыстаецца папулярнасцю навіна, калі супрацоўнік міліцыі, напрыклад, выратаваў дзіця? Людзей цікавіць толькі негатыў. Праўду не трэба даказваць. Калі мы публікуем пэўную інфармацыю, яна ўжо з'яўляецца праўдзівай. Мы не будзем аб гэтым крычаць. Крычыць той, хто хоча распаўсюдзіць інфармацыю, якая з'яўляецца непраўдзівай. Калі чалавек бездапаможны, яму застаецца толькі крычаць.

**Наталля ГАЎРУСІК:** — Сітуацыя з самалётам авіякампаніі Ryanair нам паказала, што часта сёння ўжо недастаткова проста даць аб'ектыўную інфармацыю. Пакуль праўда «адзявае штаны», хлусня абляціць паўсвету. Маланкападобна распаўсюдзілася навіна аб тым, што была ажыццёўлена прымусовая пасадка ваенным знішчальнікам. Насамрэч грамадзянскі самалёт ужо развярнуўся і ўзяў курс на пасадку ў Мінску, калі да яго далучыўся ваенны борт. МІГ-29 яго суправаджаў, а не перахопліваў — гэта істотная розніца. Мы аператыўна далі каментарый нашых Ваенна-паветраных сіл і войскаў супрацьпаветранай абароны, якія патлумачылі, як дзейнічалі дзяжурныя сілы, што не было ніякай прымусовай пасадкі (а гэта канкрэтны алгарытм дзеянняў). Што далі многія СМІ па ўсім свеце? Толькі тое, што Мінабароны пацвердзіла, што ў неба падняўся баявы самалёт. І ўсё! Інфармацыя распаўсюдзілася, але галоўнай мэты не дасягнула. Мы вымушаны былі на наступны дзень накіроўваць камандуючага ВПС і войскамі СПА на прэс-канферэнцыю, каб ён яшчэ раз пахвілінна патлумачыў дзеянні дзяжурных сіл. Мы прыйшлі да таго, што нават поўную і падрабязную інфармацыю, маючы пэўную мэту, можна ўзяць часткова і зрабіць на ёй рэзанансную навіну. І ў гэтым сэнсе вялікую дапамогу нам дае нават не сайт, які змяшчае ў асноўным навіны і афіцыйныя заявы ведамства, а сацыяльныя сеткі і тэлеграм-канал. Там мы можам даць кантэкст, які ўтрымлівае шмат дадатковай інфармацыі. Магчыма, гэтая менеў фармальная камунікацыя з грамадскасцю дапаможа калі не развейваць міфы, то хоць бы даваць кантэкст чалавеку, каб ён сам зрабіў высновы.

**Віталь НАВІЦКІ:** — На гэтым тыдні многія СМІ далі інфармацыю аб узгаранні стайні ў Ратамцы. Па-першае, трэба разумець, каб гэта была не Ратамка, а ўмоўна Верхнядзвінск, думаю, што і сёння аб гэтым ніхто нічога не ведаў, гэта нідзе не абмяркоўвалася б. Калі стаіць задача — вышукваць толькі пэўныя паскудствы, то самы лепшы варыянт напісаць «паведамляюць, што ратавальнікі прыбылі позна». Яшчэ адзін прыклад звязаны з Будслаўскім касцёлам. Для мяне абсалютна відавочна, што супрацоўнікі МНС рэальна выратавалі гісторыка-культурную каштоўнасць. Дэструктыўныя тэлеграм-каналы ніколі не напішуць нічога добрага, таму зразумела, што тэма гераічнай барацьбы за храм была апушчана: адлюстраванне подзвігу ратавальнікаў не адпавядае іх канцэпцыі. Я вырашыў дадаткова звярнуць на гэта ўвагу, напісаўшы пост у сваім Facebook, і было цікава назіраць, калі да мяне на старонку прыйшлі людзі, якія вядуць гэтыя каналы, з абвінавачваннем, што я рэкламую супрацоўнікаў МНС. Атрымліваецца, што ўсе добрыя, пазітыўныя рэчы, якія адбываюцца ў сілавых структурах, застаюцца незаўважанымі.

**Вольга ЧАМАДАНАВА:** — На чым сёння трымаецца інфармацыя? На вельмі рэзкіх загалоўках, якія крычаць. І такія загалоўкі не ўтрымліваюць рэальнай карціны падзеі, якая адбылася.

**Сяргей КАБАКОВІЧ:** — Часцяком яны маніпуляцыйныя, пададзеныя пад пэўным акцэнтам і ракурсам. Толькі нельга забываць, што калі мы транслюем пэўную інфармацыю, мы павінны быць за яе адказныя.

**Вольга ЧАМАДАНАВА:** — Праз шэсць месяцаў уступяць у сілу тыя змены, якія ўнесены ў Закон аб СМІ. І вось там з улікам падзей, якія мы назіралі ў мінулым годзе, шэраг момантаў чакае карэктывы. Вы памятаеце, як летась усе, каму не лянота, вялі стрымы ў анлайне і вяшчалі аб тым, што адбываецца на вуліцах нашага горада, за што, вядома, не прадугледжвалася ніякай адказнасці. Цяпер адказнасць у адносінах да тых журналістаў і не толькі, якія вядуць трансляцыю з такіх мерапрыемстваў, ужо прапісана нашым заканадаўствам.

**Сяргей КАБАКОВІЧ:** — Дадзеныя меры звязаны з распаўсюджваннем негатыву і падаграваннем інтарэсу да канкрэтных мерапрыемстваў. Акрамя таго, падчас такіх эфіраў людзьмі кіруюць, паказваючы рух сілавых структур. Канешне, пэўных юрыдычных момантаў насельніцтва не ведае. Аднак невыкананне закона не вызваляе ад адказнасці. Тое, што гэта будзе ўрэгулявана, — гэта вялікі крок да таго, каб людзі разумелі, што за сказанае прадугледжана адказнасць.

## ЯК ЗМАГАЦЦА З ПСЕЎДАФАКТАМІ І ФАЛЬСІФІКАЦЫЯМІ?

**Вольга ЧАМАДАНАВА:** — Мы адносна невялікая краіна, таму нам не складана атрымаць аператыўна тую ці іншую інфармацыю, прыняць рашэнне і адрэагаваць. І блогераў у нас не такая вялікая колькасць, каб гэтую інфармацыю падхопліваць і хутка распаўсюджваць. У інтэрнэце з'явілася шмат экспертаў, якія нешта абмяркоўваюць. Хоць мы, афіцыйныя прадстаўнікі сілавых ведамстваў, павінны быць у цэнтры ўвагі. І ў гэтым пытанні адзінымі з намі павінны быць і сродкі масавай інфармацыі. Калі ўзнікла канкрэтная сітуацыя — значыць даюць інфармацыю ўсе тыя, хто павінен аб гэтым сказаць: дзе і што б не адбылося. Па маім перакананні, мы і так ужо бачым вялікі прагрэс, як працуюць сёння журналісты нашых дзяржаўных каналаў і друкаваных выданняў. Змяніцца карэнным чынам нас прымусіла сітуацыя. Я таксама ў 2019 годзе не чакала, што ў 2020-м стане ўсё інакш, і прэс-служба МУС будзе працаваць як на перадавой.

**Сяргей КАБАКОВІЧ:** — Невыпадкова вельмі важна наладзіць сеткавае ўзаемадзеянне сілавых структур, дзяржаўных органаў па распаўсюджванні дакладнай інфармацыі, каб яна была данесена большай частцы насельніцтва. Калі, напрыклад, у «Інстаграме» МНС з'явіцца інфармацыя аб тым, што ў вайсковай часці патушаны пажар, танкі не гарэлі, — гэтага будзе дастаткова, і пытанне поўнасцю здымецца. Давайце аб'ядноўвацца на нашых вялікіх пляцоўках і адзін аднаго падтрымліваць.

**Вольга ЧАМАДАНАВА:** — Бываюць выпадкі, што, калі мы аператыўна даём інфармацыю, яна можа адрозніваецца ад тых абставін, якія высвятляюцца і ўстанаўліваюцца пазней. І калі мы разумеем, што інфармацыя недакладная або ў ёй не хапае пэўных фактаў, мы ўсё роўна іх дабавім, як мінімум дапоўнім. Калі наступае час ікс, думаць няма калі. Твая задача — аператыўна прымаць рашэнні, і тут ты павінен дзейнічаць хутка. Любая вайна пачынаецца з інфармацыйнай. У нас ужо ёсць пэўны вопыт, якім мы дзелімся ў міжнародным фармаце. Сёння шэраг краін зацікаўлены прыязджаць да нас і вывучаць вопыт інфармацыйнага процідзеяння ў перыяд беспарадкаў мінулага года. Трэба сказаць, што ўся гэтая сітуацыя нас толькі аб'яднала, зрабіла яшчэ больш моцнымі.

**Віталь НАВІЦКІ:** — Бачу шлях у нарошчванні ўласнага кантэнту на шматлікіх пляцоўках і ва ўзаемадзеянні ведамстваў, усіх дзяржаўных структур з тымі, у каго няма мэты знішчаць, разбураць, распальваць. Трэба працаваць у тым ліку з недзяржаўнымі СМІ і інтэрнэт-пляцоўкамі, якія займаюць адэкватную пазіцыю і да сілавога блоку, і да дзяржавы ў цэлым.

**Наталля ГАЎРУСІК:** — Ва ўсім свеце шукаюць спосабы барацьбы з псеўдафактамі і фальсіфікацыямі. Некаторыя краіны пайшлі па такім шляху, што заканадаўча замацавалі абавязак для сацыяльных сетак — сачыць за самацэнзурай. Калі ёсць скаргі на пэўны пост (з пункту гледжання дакладнасці, напрыклад), то сацыяльныя сеткі павінны візуальна гэта прадэманстраваць. І пост ужо не фігурыруе як проста рэтрансляцыя інфармацыі, ён адзначаны як інфармацыя, якая выклікае пытанні. Калі ж гэта не выконваецца ў сацыяльнай сетцы, прадугледжаны гіганцкія штрафы.

## ВОПЫТ, ЯКІ ЗРАБІЎ БОЛЬШ МОЦНЫМІ

**Сяргей КАБАКОВІЧ:** — У любым выпадку, мы, людзі ў пагонах, згодна з канцэпцыяй нацыянальнай бяспекі, павінны нейтралізаваць любыя пагрозы, у тым ліку ў інфармацыйнай сферы. Трэба абавязкова рэагаваць на распаўсюджванне недакладнай і наўмысна перакручанай інфармацыі. Насаджэнне грамадскасці пэўнай маніпуляцыйнай псеўдапраўды заўсёды будзе прадухіляцца. Фарміраванне спрыяльнай грамадскай думкі неабходна дзейнасці ўсёй сістэмы забеспячэння бяспекі краіны.

**Віталь НАВІЦКІ:** — Сістэма развіваецца, яна мяняецца — я кажу як мінімум пра камунікацыю. Пры любым процістаянні розных сістэм выстаіць тая, якая лепш за ўсё арганізавана, якая здольная эвалюцыяніраваць, мяняцца — такая без варыянтаў і пераможа. Відавочна, што сістэма сілавых структур па інфармаванні грамадскасці аказалася гатовая да любых выклікаў і паспяхова развіваецца далей.

**Наталля ГАЎРУСІК:** — У гэты складаны час гіганцкі скачок у плане камунікацыі зрабілі ўсе сілавыя структуры. У пэўным сэнсе мы вымушаны былі гэта зрабіць. Гэта сведчыць аб тым, што няма ліха без дабра. Мы аптымізавалі работу да такой ступені, што яна паскорылася ў некалькі разоў. Выпрацавалі кожны сваю схему, як паступаць у тых ці іншых крытычных сітуацыях, зрабілі пэўныя высновы: палепшылі ўзаемадзеянне або цвяроза паглядзелі на кантакты з пэўнымі СМІ. У нас ужо ёсць пэўны вопыт, які будзе выкарыстоўвацца нават тады, калі настане спакойны час. Вядома, як было раней, так ужо не будзе. Добра! Мы навучыліся хутчэй думаць, працаваць, дзесьці больш аператыўна прымаць рашэнні і прадбачыць наступствы, сталі больш мабільнымі. Але наперадзе яшчэ доўгі, складаны шлях. Так ці інакш — дарогу адолее той, хто ідзе.

**Вольга ЧАМАДАНАВА:** — Мне б не хацелася, каб паўтарылася тое, што прыйшлося нам перажыць: у першую чаргу, гэта датычыцца інфармацыйнага поля. Ёсць вялікае жаданне будаваць сённяшні інфармацыйны дзень крыху ў іншым кірунку. Вядома, гэта рэпутацыя ведамства, работа нашых супрацоўнікаў. На жаль, многія сёння не бачаць, як штодзённа рызыкуе міліцыянер у сваёй прафесійнай дзейнасці. Калі, напрыклад, дзяўчынка хоча скокнуць з моста і яе спыняе супрацоўнік праваахоўных органаў, міліцыянер у гэты момант не пазіруе на камеру: ён выконвае свой службовы абавязак. Нашы людзі становяцца яшчэ мацнейшымі, у тым ліку ў пытанні процібортсва. Мы аб'ядноўваемся. Мы гэтую інфармацыю прымаем, а разам з тым разумеем, дзеля чаго служым. Кожны з нас думае не проста аб абароне сваёй Радзімы, кожны думае аб яе будучыні. Нас ніхто не запалохае. Мы атрымалі вопыт, але нам ёсць да чаго імкнуцца. Наш круглы стол — таму пацвярджэнне: у такі складаны перыяд мы знаходзім час, каб сустрэцца, бо мы неабыякавыя да таго, што адбываецца.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

Блізкая ўлада

# ЛЮДЗІ ПАВІННЫ ВЕДАЦЬ АБ РАБОЦЕ НА МЕСЦАХ

**Трэба больш інфармаваць людзей аб рабоце, якая праводзіцца на месцах, аб праблемах, якія вырашаюцца. Тады будзе менш пытанняў ад насельніцтва і спекуляцый. Пра гэта заявіла старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА на выязным пашыраным пасяджэнні Прэзідыума Савета Рэспублікі на тэму «Аб эфектыўнасці і выніках работы Мінскага райвыканкама, Мінскага раённага Савета дэпутатаў са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб у 2020 годзе і за пяць месяцаў 2021 года».**

Наталля Качанава патлумачыла, што Мінскі раён выбраны па той прычыне, што ён самы вялікі ў сталічным рэгіёне і мае сваю спецыфіку з-за блізкасці да Мінска. Напярэдадні яна сама і іншыя сенатары правялі выязныя прыёмы ў розных сельсаветах і пераканаліся, што прыкладна 70 % тых пытанняў, якія паступаюць, могуць і павінны вырашаць мясцовыя органы ўлады. Пры гэтым ёй прыём спадабаўся тым, што людзі прыходзілі ў тым ліку з прапановамі, ідэямі.

«На чале ўсяго — чалавек. Трэба ўмець працаваць з людзьмі, умець слухаць і чуць чалавека, яго запыты. Поспех працы любога кіраўніка на любым узроўні, аж да прадпрыемстваў, залежыць ад гэтага, — падкрэсліла кіраўнік Савета Рэспублікі. — Ад таго, як складваецца работа са зваротамі грамадзян на месцах, залежыць стаўленне людзей да ўлады ў цэлым».

Для таго, каб забяспечыць такую эфектыўнасць, на пасяджэнне былі запрошаны і сенатары, і дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, і абласнога Савета дэпутатаў, і кіраўнікі прадпрыемстваў. Наталля Качанава звярнулася да іх з просьбай дзяліцца прапановамі па ўнясенні змяненняў у Закон «Аб зваротах грамадзян» і іншымі ініцыятывамі. І яны прагучалі.

Напрыклад, для вырашэння праблемы якасці пітной вады ў невялікіх вёсках устанаўліваць станцыі абезжалезвання немэтазгодна. Але ёсць ужо распрацоўкі ўстановак, якія ўбудоўваюцца ў калодзежы. Засталося прайсці сертыфікацыю. «Вядома, калі гэта дапаможа вырашыць праблему, гэта наша справа гонару — дапамагчы распрацоўшчыкам укараніць гэта ў вытворчасць і ў жыццё», — адзначыла Наталля Качанава.

У цэлым жа яна прытрымліваецца таго пункту гледжання, што павінна яшчэ больш ініцыятыў сыходзіць ад дэпутатаў, якія бліжэй за ўсё да людзей. «Роля дэпутацкага корпуса можа быць больш знакавай у рабоце са зваротамі грамадзян», — сказала яна.

**БелТА.**

# ДОБРАЎПАРАДКАВАННЕ ВОІНСКІХ ПАХАВАННЯЎ, ЧЫГУНАЧНЫХ ПЕРАХОДАЎ

і іншыя пытанні агучылі жыхары Пухавіцкага раёна старшыні Мінаблвыканкама

**Восем чалавек прыйшлі на прыём грамадзян да кіраўніка Міншчыны Аляксандра ТУРЧЫНА ў Пухавіцкім раёне. Людзей хвалявалі розныя пытанні: ад камунальных да добраўпарадкавання воінскіх пахаванняў.**

Апошняе ўзняў старшыня Мінскай абласной арганізацыі грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз афіцэраў» Уладзімір Белавусаў. Па яго словах, у вёсцы Блонь знаходзіцца магіла ахвярам вайны і помнік воінам-інтэрнацыяналістам, якія патрабуюць рамонту. Неабходна таксама добраўпарадкаваць лясную дарогу, што вядзе да брацкай магілы, што за шэсць кіламетраў ад вёскі Міжрэчча. Там пахаваны 350 мірных жыхароў і партызан брыгад 1-й Мінскай і «Полымя», што загінулі ў 1941—1944 гадах.

Аляксандр Турчын лічыць, што варта стварыць агульныя помнікі ў буйных населеных пунктах, бо да лясных магіл цяжка дабрацца, а ў аграгарадках іх будуць пастаянна даглядаць.

Жыхары вуліцы Гучака і суседніх у Мар'інай Горцы прасілі пасадзейнічаць у тым, каб змяніць маршрут грамадскага транспарту, паколькі ім далёка ісці да прыпынку. Прадстаўнік райвыканкама ў адказ паабяцаў, што маршрут гарадскога аўтобуса № 3 будзе працягнуты. Для гэтага неабходна ўладкаваць дванаццаць аўтобусных прыпынкаў. Работы пачнуцца ў наступным годзе. Аляксандр Турчын не пагадзіўся з такой пастаноўкай пытання і даручыў адпаведным службам усталяваць прыпынкі сёлета да сярэдзіны ліпеня.

Гараджане таксама паскардзіліся, што ад 2-га чыгуначнага пераезду часам цяжка дабрацца да вуліц Энгельса і Кастрычніцкай. Пасля дажджоў размывае дарогу. Аляксандр Турчын прапанаваў заасфальтаваць абочыну дарогі, каб людзям было зручна і бяспечна ісці. Пры гэтым старшыня Мінаблвыканкама заўважыў, што праблема належнага ўладкавання чыгуначных пераездаў існуе і ў іншых населеных пунктах Міншчыны. У Смалявічах, Калодзішчах пачалі іх вырашаць, але на гэта неабходны немалыя фінансавыя сродкі.

Падчас прыёму жыхары закранулі пытанні якасці пітной вады, добраўпарадкавання тэрыторый і дарог. Для зняцца некаторых з іх патрабуецца больш часу. Аляксандр Турчын распарадзіўся інфармаваць грамадзян аб планах мясцовых органаў улады на кожны год, аб фінансавых магчымасцях у той ці іншай справе.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

Парламенцкі дзённік

## Законапраект аб змяненні Канстытуцыі гатовы да разгляду

**Законапраект аб змяненні Канстытуцыі гатовы да разгляду ў першым чытанні на вясновай сесіі. Нагадаем, што ён быў унесены ў Палату прадстаўнікоў Прэзідэнтам і прадугледжвае, што выбары дэпутатаў праводзяцца ў адзіны дзень галасавання. Мясцовыя Саветы дэпутатаў 28-га склікання будуць ажыццяўляць свае паўнамоцтвы да пачатку паўнамоцтваў мясцовых Саветаў дэпутатаў, абраных у адзіны дзень галасавання.**

Згодна з працэдурай, дакумент быў падрыхтаваны і прайшоў узгадненне ў пастаянных камісіях, атрымана заключэнне ад экспертных органаў, унесены невялікія тэхнічныя праўкі, ён гатовы да абмеркавання. У чэрвені парламентарыі разгледзяць яго ў першым чытанні, а на асенняй сесіі — у другім.

Учора прайшло пашыранае пасяджэнне спецыяльнай камісіі, створанай для падрыхтоўкі гэтага закона.

— У адпаведнасці з артыкулам 170 рэгламенту Палаты прадстаўнікоў, камісія павінна ўнесці свае прапановы на разгляд Палаты прадстаўнікоў. У склад камісіі ўваходзяць старшыні Пастаянных камісій Палаты прадстаўнікоў, а на пашыранае пасяджэнне таксама запрошаны і іншыя дэпутаты. Мы разгледзім усе працэдурныя пытанні і прымем адпаведнае рашэнне, — расказаў **старшыня Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Палаты прадстаўнікоў Валянцін СЕМЯНЯКА.**

## «Бездань паміж інтарэсамі ўкраінцаў і палітычнымі структурамі Украіны»

Тым часам **старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Андрэй САВІНЫХ** пракаментаваў заяву Вярхоўнай рады Украіны па Беларусі, якую яна прыняла адносна інцыдэнту з пасадкай самалёта кампаніі Ryanair у Мінску 23 мая.

— Мы з вялікім шкадаваннем успрынялі заяву Вярхоўнай Рады Украіны. Сумна бачыць, што найвышэйшы заканадаўчы орган брацкай, блізкай для нас краіны паступова ператвараецца ў легкаважны палітычны інстытут, які імкнецца дзейнічаць у інтарэсах знешніх замежных цэнтраў уплыву. Бездань паміж інтарэсамі ўкраінскіх грамадзян і палітычнымі структурамі Украіны, якія паступова дэградуюць, пастаянна ўзрастае. На гэтым фоне мы можам выказаць падзяку тым украінскім дэпутатам, якія галасавалі супраць дадзенай заявы ці нават устрымаліся падчас галасавання. Улічваючы характар палітычнай атмасферы ў Кіеве, гэта ўжо можна разглядаць як праяўленне грамадзянскай пазіцыі.

**Алена КРАВЕЦ.**

Меркаванні

# «Як бомба, якая выбухнула»

**Інтэрв'ю Рамана Пратасевіча праграме «Маркаў. Нічога асабістага», якое выйшла вечарам у чацвер на канале АНТ, — адзін з самых папулярных сюжэтаў у сеціве, які абмяркоўваюць і ў Беларусі, і за яе межамі. (Дарэчы, спасылка на яго прагляд ёсць і на нашым сайце zviazda.by.) Яно стварыла вялікі рэзананс, і гаварыць аб ім будуць яшчэ не адзін дзень. Мы сабралі толькі некаторыя меркаванні экспертаў, якія каментавалі перадачу АНТ назаўтра пасля выхаду яе ў эфір.**

**Валянцін СЕМЯНЯКА, старшыня Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Палаты прадстаўнікоў:**

«Я быў у камандзіроўцы ў Сірыі, дзе назіраў за ходам правядзення выбараў па запрашэнні парламента краіны. І ўбачыў там, будзем так казаць, вынікі разбуральнай дзейнасці Захаду па дэстабілізацыі абстаноўкі і жабрацтва гэтай краіны. І ў інтэрв'ю Пратасевіча яшчэ раз пацверджана, што не ўнутраныя нейкія ёсць перадумовы для ўзнікнення пратэсных настрояў, а менавіта знешнія. І яны не проста падтрымліваюцца — яны арганізоўваюцца, фінансуюцца і накіроўваюцца. У гэтым чарговы раз пераканала гэта інтэрв'ю».

**Пётр ПЯТРОЎСКІ, палітолаг, эксперт РГА «Белая Русь»:**

«Я вам так скажу: інтэрв'ю было як бомба, якая выбухнула. Але, на жаль, ёсць некаторая частка грамадства, псіхалагічна замбіраваная, якая не будзе ўспрымаць ніякія рацыянальныя доказы. Мы да гэтага павінны быць гатовыя. Для мяне асабіста ўсе гэтыя факты, агучаныя Пратасевічам, былі вядомыя. Адзіны момант, што Пратасевіч лепш ведаў унутраную «кухню», паслядоўнасць, храналогію ўсіх дзеянняў — калі з'явіўся NEXTA, калі яго пасадзілі ў тым ліку на фінансаванне расійскім алігархам. Другі вельмі важны момант у тым, што Пратасевіч расказаў гісторыю пра фэйкавае мініраванне «Беларускага дома» ў Варшаве самімі апазіцыянерамі. «На мой погляд, гэта сведчыць пра тое, што ўсе факты мініраванняў, дыверсій у 2020—2021 гадах у дачыненні да школ, гандлёвых цэнтраў, чыгуначных вакзалаў і іншых стратэгічных аб'ектаў — гэта ўсё павінна правярацца зыходзячы з датычнасці гэтых збеглых таварышаў, якія сядзяць за мяжой. Напэўна, самы важны факт — тое, што Пратасевіч сказаў гэта сам, асабіста, без ціску. І тыя, хто крытыкуе інтэрв'ю, крытыкуюць не яго змест, а саму наяўнасць гэтага інтэрв'ю, яго некаторыя псіхалагічныя асаблівасці. Гэта яшчэ раз сведчыць, што факталогію, якую выказаў Пратасевіч, ніякім чынам нельга паставіць пад сумненне».

**Сяргей МІХЕЕЎ, расійскі палітолаг, палітык, радыё- і тэлевядучы:**

«Лічу, што гэта не апошняе інтэрв'ю Рамана Пратасевіча. Я думаю, ён раскажа яшчэ нямала. Дарэчы, гэта яшчэ раз пацвярджае досыць сумнеўную характарыстыку гэтых людзей, якія будуюць з сябе нейкіх напаўбагоў. І яшчэ раз сведчыць пра тое, што сапраўды ўсе гэтыя хваляванні, акцыі ў Беларусі, па-першае, спансіруюцца з-за мяжы. Па-другое, тыя, хто іх арганізоўвае, зусім не клапоцяцца пра дабрабыт беларускага народа, ім галоўнае — змяніць уладу, а як, на што — не мае значэння. І трэцяе — тое, што ўнутры ў іх канфлікты, што таксама, на самай справе, не здзіўляе — гэта звычайная справа сярод усякага роду «рэвалюцыянераў». Таму што ўсе рэвалюцыянеры па ўнутраным стане самі сябе лічаць напаўбагамі. Яны лічаць, што настолькі справядлівую справу вядуць, што яны самі па сабе ўжо з'явы. А калі такія з'явы збіраюцца ў кучу, яны пачынаюць адзін аднаго грызці, як павукі ў слоіку».

**Паводле БелТА.**

Далучайцеся!

# «МЫ ПЛАНУЕМ ПРАВЕСЦІ МІНСКІ ПАЎМАРАФОН З МАШТАБАМ»

**Да легендарнага Мінскага паўмарафона засталося 100 дзён. У мінулым годзе галоўная бегавая падзея была перанесена, і ад таго спартыўнае свята сёлета яшчэ больш доўгачаканае і адметнае. І пакуль арганізатары актыўна рыхтуюцца (дарэчы ужо прадставілі майкі — хутка ўсе ўбачаць і медалі), удзельнікі рэгіструюцца ці раздумваюць.**

Хто хоць раз не збіраўся з панядзелка пачаць бегаць і калісьці прабегчы паўмарафон? Але зацыклівацца на адным паўмарафоне не варта. Амаль кожны месяц Беларуская федэрацыя лёгкай атлетыкі праводзіць забегі, у якіх праверыць свае сілы могуць самыя розныя бегуны. На 2021 год федэрацыяй запланавана аж 18 забегаў. Гэта значыць, што бег становіцца ўсё больш папулярным сярод беларусаў. Як ніхто іншы, аб гэтым ведае Вераніка Грэсь. Генеральны сакратар Беларускай федэрацыі лёгкай атлетыкі не толькі арганізоўвае забегі, але і сама ў іх удзельнічае. І заклікае ўсіх палюбіць бег.

***— Вераніка, з кожным годам федэрацыя лёгкай атлетыкі праводзіць усё больш масавых забегаў, адпаведна, людзям гэта цікава. Наколькі ў нашай краіне развіта бегавая культура?***

— Ва ўсім свеце развіццё бегавой культуры пачалося шмат гадоў таму, і з кожным годам яна становіцца ўсё больш папулярнай і ў Беларусі, чаму мы вельмі рады. Колькасць удзельнікаў нашых забегаў павялічваецца, мы праводзім больш стартаў. Нешта прыдумваем самі, нешта бяром у іншых краін. Нядаўна мы праводзілі забег «Бярэзіна-Трэйл» і спынілі рэгістрацыю дзесьці за два тыдні да старту, таму што слоты закончыліся. І пасля да нас звярталася шмат людзей, якія хацелі паўдзельнічаць, але не паспелі зарэгістравацца. А мы нічым не маглі ім дапамагчы, бо ў нас усё было разлічана на 200 чалавек. Мы былі шчыра рады, што гэтая любоў да бегу дайшла і да рэгіёнаў — «Бярэзіна-Трэйл» праходзіў не ў Мінску, а ў Барысаве. І акрамя нашай федэрацыі, забегі праводзяць і прыватныя арганізацыі, што вельмі радуе, паколькі наша мэта — зрабіць людзей здаровымі і далучыць да здаровага ладу жыцця. Так бегавая культура і фарміруецца.

***— На вопыт якіх краін варта раўняцца пры фарміраванні бегавой культуры?***

— Я думаю, на краіны Еўропы — там шмат выдатных гонак высокага ўзроўню. На ўвесь свет вядомыя марафоны ў Бостане і Нью-Ёрку. У Кітаі шмат людзей бегае, у іх гэта ўжо як рэлігія. Японцы любяць бегаць. І ўжо ў Беларусі ёсць людзі, якія ўдзельнічаюць у кожным забегу, выязджаюць на замежныя старты. З кожным годам да нас прыязджае ўсё больш замежнікаў. Многія з іх любяць наш Мінскі паўмарафон — прыгожая траса, цэнтр горада, мы бясплатна робім для іх візы. І на нашым паўмарафоне ёсць адчуванне свята. У свеце большасць забегаў — не ўсе, але многія — як звычайныя спаборніцтвы, а ў нас такі спартыўны фестываль у Дзень горада.

***— У вашым календары ёсць забегі, якія сёлета праходзяць упершыню?***

— Так, у Стоўбцах 20 чэрвеня пройдзе забег «Шляхам Якуба Коласа» па родных мясцінах пісьменніка. Потым у Мінску пройдзе ультрамарафон — 100 кіламетраў ноччу з фінішам на стадыёне «Дынама». І на канец лета — пачатак восені запланавана яшчэ адно бегавое мерапрыемства, першы падобны старт у гісторыі беларускага бегу. Пакуль не буду раскрываць інтрыгу.

***— Як узнікае ідэя праводзіць забегі ў неспартыўных, а гістарычных мясцінах?***

— Я хацела б адзначыць нашага спецыяліста Сяргея Зыкава, ідэйнага натхняльніка ўсіх забегаў. Дзякуючы яго фантазіі, крэатыўнасці, хобі, у тым ліку звязаным з гісторыяй, у нас ёсць такія цікавыя мерапрыемствы. Яны не толькі пра спорт. Я ў мінулым годзе ездзіла ў Мядзел. Мабыць, ніколі б проста так туды не даехала. А так паехала на забег, абышла ўвесь горад, палюбавалася на азёры — прырода проста неверагодная! Так і сумяшчаецца прыемнае з карысным: людзі бегаюць, даведваюцца пра гісторыю горада, вывучаюць сваю краіну. У гэтым і была наша мэта праводзіць забегі ў невялікіх гарадах, каб людзі знаёміліся з Беларуссю.

***— А ўмовы для бегу ў такіх маленькіх гарадах ёсць?***

— Дык у гэтым жа і прыгода — бегчы не проста па роўным асфальце, а па палях, лясах, узгорках. Гэта ж трэйл. Я не скажу, што ў нас вельмі цяжкія трэйлавыя гонкі. Нармальныя перашкоды, але дастаткова таго, каб усё ўбачыць і адчуць новыя эмоцыі. Я ўдзельнічала ў такім забегу ў Капылі. Цяжкавата: трэба было і па гразі, і па пашах, і праз стагі пералазіць. Усё ідзе ад такога віду лёгкай атлетыкі, як крос, які праходзіць не па роўнай трасе, а па перасечанай мясцовасці. І ў масавых забегах мы проста дадаём перашкод для антуражу. Ва ўсім свеце гэта распаўсюджана, людзі нават па гарах бегаюць. А мы выкарыстоўваем асаблівасці беларускай прыроды.

***— Асаблівая методыка падрыхтоўкі да такіх забегаў патрэбная?***

— Галоўнае — агульная падрыхтоўка, як да звычайнага забегу. Але падчас бегу з перашкодамі трэба правільна дыхаць, таму што перашкода збівае нармальны рытм дыхання і пасля трэба яго вярнуць. Калі нешта прыходзіцца несці, то варта дадаць сілавыя практыкаванні. Але галоўнае — агульная фізічная падрыхтоўка.

***— Вераніка, у 2020 годзе Мінскі паўмарафон быў адменены. Як прайшоў год без галоўнай бегавой падзеі краіны?***

— Мінскі паўмарафон для арганізатараў — як дзіця: ты яго выношваеш, ім жывеш, рыхтуешся да яго, а ў мінулым годзе яно «не нарадзілася»... Таму зараз мы з надзеяй чакаем паўмарафону ў 2021 годзе. Рэгістрацыя не спынялася. Усе слоты з 2020 года захаваліся, і людзі працягваюць рэгістравацца. На 2021-ы ў нас ліміт — 42 тысячы ўдзельнікаў, і мы іх чакаем. Асноўны паток рэгіструецца ў жніўні—верасні, таму слоты яшчэ ёсць. Мы плануем правесці Мінскі паўмарафон з маштабам



і гатовыя гэта зрабіць. Але паглядзім, што будзе бліжэй да 12 верасня. Дарэчы, слоты нашага паўмарафону каштуюць танней, чым у Еўропе. Калі ўзяць Лонданскі паўмарафон, то там слот каштуе 80—100 фунтаў. У нас пачынаецца ад 40 рублёў, гэта прыкладна 20 долараў, розніца істотная. Ды і ў нас лёгка зарэгістравацца — у Бостане, Нью-Ёрку ідзе розыгрыш слотаў, адбіраюць удзельнікаў. А ў Мінску прабегчы па прыгожай трасе можа любы ахвотны.

***— Сярэбраны лэйбл Міжнароднай асацыяцыі лёгкай атлетыкі ў Мінскага паўмарафону застанецца?***

— Канешне, і ў гэтым годзе мы будзем яго пацвярджаць. На шчасце, Міжнародная асацыяцыя лёгкай атлетыкі сёлета зрабіла больш лёгкімі ўмовы для пацвярджэння статусу. Гэта датычыцца прадстаўніцтва замежных атлетаў, і нам будзе дастаткова прадставіць сваіх дзяўчат, вельмі добрая марафонская каманда, будзе выступаць у паўмарафоне. Мы хацелі б і залаты лэйбл атрымаць, але пакуль гэта вельмі дорага. Трэба заплаціць уступны ўзнос, падняць прызавы фонд і выканаць вельмі шмат патрабаванняў. Таму пакуль, мабыць, не варта. Магчыма, што ў перспектыве атрымаецца, калі мы вырасцем у нешта больш якаснае і яркае.

***— У Мінску можа калі-небудзь прайсці марафон?***

— Мы б вельмі гэтага хацелі, але тады прыйдзецца перакрываць горад не на 3,5 гадзіны, а на значна большы час. На марафон закладваецца каля 7,5 гадзіны, бо бегуны ж розныя. І калі рабіць нават адну «пятлю», то трэба перакрываць увесь горад. А калі дзве «пятлі» — то ўвесь горад разам з цэнтрам. Але хачу сказаць, што ў лістападзе ў Мінску адбудзецца ультрамарафон па веладарожцы, у мінулым годзе ён прайшоў дастаткова паспяхова. Але гэта не масавы забег. Спадзяюся, што ў найбліжэйшыя гады ў нас усё ж адбудзецца і марафон. Мы ўжо бачым людзей, гатовых прабегчы і 42 кіламетры, але культура бегу толькі фарміруецца. Таму трэба некалькі гадоў пачакаць.

***— Вераніка, ты не толькі арганізатар забегаў, але і іх удзельнік. Як пачаліся твае стасункі з бегам?***

— Я ніколі не магла ўявіць, што буду працаваць у спорце і тым больш ім займацца, хацела быць адвакатам. Але ў 2018 годзе амаль выпадкова трапіла на работу ў Беларускую федэрацыю лёгкай атлетыкі на пасаду юрыста. Займалася сваімі юрыдычнымі справамі, а фізкультура для мяне заўсёды была заняткам, да якога не ставілася сур'ёзна. Паўмарафон 2019 года стаў першым, дзе я была арганізатарам, і для мяне былі загадкай заўвагі ад бегуноў. А потым з'явілася звычайнае дзявочае жаданне прывесці фігуру ў парадак, і я палічыла, што дапаможа мне ў гэтым бег. Пачала рыхтавацца да «Прыгожага забегу» ў сакавіку і захапілася бегам. А потым купіла сабе правільныя красоўкі, узяла ногі ў рукі і адбегала амаль усе нашы старты і многія іншыя. Гэта карысна не толькі для майго арганізма, але і для працы. Я знутры заўважаю моманты, якія можна ўдасканаліць, прымяніць у сваіх забегах ці адмяніць.

***— Што ты можаш парэкамендаваць тым, хто плануе выйсці на прабежку «з панядзелка»?***

— Я раю перанесці панядзелак на сёння. Ёсць лайфхак: расказаць аб сваіх планах у сацыяльных сетках — падмануць людзей будзе сорамна. Ці можна ўзяць каго-небудзь за кампанію. У нас працуе бегавы клуб Follow Minsk, дзе можна знайсці аднадумцаў і бясплатна атрымаць парады трэнера (для пачынаючых бегуноў гэта вельмі важна). Трэніроўкі праходзяць кожную сераду ў парку Перамогі. Можна паставіць сабе мэту, напрыклад, бегаць два месяцы, а потым купіць сабе нешта, што даўно хацелася. І галоўная парада — не раздумваць, а абуваць красоўкі і бегчы: пасля гэтага першага кроку лягчэй рабіць астатнія.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# КУПАЛЛЕ Ў СТЫЛІ БЕЛАРУСКАГА РУЧНІКА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— У яго праграме прагучаць музычныя творы беларускіх выканаўцаў і калектываў, песні, якія спадабаліся людзям і засталіся ў іх памяці, — звярнуў увагу **намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый МАЛАШКА.**

Упершыню на свята ў Александрыю прыедзе трупа Купалаўскага тэатра. «Гэта будзе ўнікальная магчымасць для жыхароў аграгарадка і гасцей фестывалю ў камернай абстаноўцы паглядзець спектакль аднаго з найлепшых тэатраў», — падкрэсліў Ігар Петрышэнка.

Напярэдадні Купалля ў Александрыі тэатр выступіць на сцэнах Магілёўскага і Бабруйскага драмтэатраў. Гэта будзе своеасаблівай рэпетыцыяй перад Александрыяй.

Галоўная падзея свята — гала-канцэрт, на якім традыцыйна прысутнічае Прэзідэнт краіны. Сёлета ён пройдзе пад назвай «Песні маёй краіны». Білеты на гала-канцэрт ужо ў продажы, іх можна набыць на сайце kvitki.by. «Яго праграма складзена па заяўках жыхароў Александрыі», — падкрэсліў **міністр культуры Анатоль МАРКЕВІЧ.**

Гледача ўразяць і тэхнічныя магчымасці сцэны, якая будзе круціцца. Гэта дазволіць хутка мяняць дэкарацыі пад кожны нумар і рабіць цікавыя сцэнічныя замалёўкі. У канцэрце будуць задзейнічаны зоркі не толькі беларускай эстрады.

Купалле ў Александрыі заўсёды ўражвае ўдзельнікаў і гасцей вялікімі гандлёвымі радамі, дзе можна знайсці ўсё, што душы патрэбна. Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» **старшыня Александрыйскага сельвыканкама Мікалай СТАЯКОЎ,** на купальскай лугавіне прадпрыемствы і арганізацыі раёна ўжо вядуць падрыхтоўку для будаўніцтва асобных пляцовак для кожнай вобласці. Гэта, дарэчы, таксама навінка сезона. Гасцям будзе вельмі зручна азнаёміцца з дасягненнямі кожнага рэгіёна. Тут можна будзе набыць як прамысловыя, так і харчовыя тавары на любы густ.

Абяцае ўразіць і інтэрактыўная выстава навінак буйнога беларускага вытворцы Мінскага трактарнага завода. Кожны жадаючы зможа не толькі сфатаграфавацца на фоне перадавой тэхнікі, але і нават пасядзець за рулём. Завод плануе пазнаёміць усіх, хто цікавіцца гісторыяй машынабудавання, з асаблівасцямі свайго развіцця. Дэманстрацыя навінак адбудзецца пад маркай «Зроблена ў Беларусі».

Будзе чым захапіцца і аматарам кнігі. Найлепшыя літаратурныя творы, навінкі, прэзентацыі запланаваны на пляцоўцы «Свята кнігі». Гасцей тут будуць сустракаць пісьменнікі і творчая інтэлігенцыя. Яны ўжо гатовыя абмеркаваць новыя тэндэнцыі ў літаратуры.

На свята запрошана болей чым 60 майстроў з Расіі і Украіны. Пра гэта карэспандэнту «Звязды» паведаміў **старшыня Рэспубліканскага савета па пытаннях клубнай дзейнасці і народнай творчасці пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь Алег ХМЯЛЬКОЎ.**

— Гэта нашы даўнія партнёры, і ніякія знешнія змяненні не могуць паўплываць на нашы з імі адносіны, — падкрэсліў ён.

Усё, што будзе адбывацца на купальскай лугавіне, звязана з тэмай беларускага ручніка. А народныя ўмельцы і майстры прадэманструюць «ручнік народнага адзінства».

— Гэта повязь часоў, сімвал культуры, сямейных стасункаў, — кажа Алег Хмялькоў. — Спрадвечна ўсё жыццё чалавека было звязана з ручніком — ад нараджэння да апошняга ўздыху. Таму і тэма выбрана такая. Яна пройдзе чырвонай ніткай праз увесь фестываль, па ўсім сцэнарыі свята.

Адпаведна, і адкрыццё фестывалю будзе звязана з тэматыкай ткацтва. Усе вобласці, дарэчы, ткуць да Купалля ў Александрыі свае ручнікі, яны потым будуць прадстаўлены ў агульным варыянце.

Да радасці дзяцей запланаваны цыркавыя выступленні, гурманаў парадуюць майстры кухарскай справы, аматараў народных твораў — рамеснікі і майстры, а паказытаць нервы дапамогуць авіятары, якія пакажуць захапляльнае паветранае шоу. Завершыць вялікую праграму традыцыйнае купальскае вогнішча, пасля якога да дзвюх гадзін раніцы будзе грымець вясёлая маладзёжная дыскатэка.

**Намеснік старшыні Шклоўскага райвыканкама Аляксандр ІВАНЕНКА** адзначыў, што, акрамя вялікай праграмы на асноўнай пляцоўцы, у рамках купальскага свята будзе адзначацца яшчэ адно свята — 85-годдзе ўтварэння беларускай Дзяржаўтаінспекцыі. Яго пляцоўка будзе знаходзіцца насупраць спарткомплексу «Александрыя», якраз па ходу аўтамабільнага руху гасцей Купалля.

— І там таксама запланавана шмат чаго цікавага і для дзяцей, і для дарослых, — абяцае Аляксандр Іваненка. — Адбудзецца канцэрт зорак беларускай эстрады, будуць працаваць тэматычныя пляцоўкі, забяспечым відэасувязь з усімі рэгіёнамі Беларусі.

Да ведама тых, хто збіраецца наведаць купальскае свята: прадугледжаны дадатковыя рэйсы чыгуначнага і аўтобуснага транспарту. Расклад іх руху ўжо размешчаны на сайце KUPALLE.BY.

Летась свята наведала каля 60 тысяч чалавек (яно ўпершыню праходзіла пад патранатам ЮНЕСКА), у лепшыя гады гэта лічба даходзіла да 100 тысяч. «У любым выпадку мы гатовы прыняць любую колькасць людзей, — запэўніў Аляксандр Іваненка. — У тым ліку з суседніх нам краін. Некаторыя замежныя калектывы і рамеснікі ўжо пацвердзілі свой прыезд. Калі нічога за гэты месяц не зменіцца, мы будзем рады сустрэць іх на гасціннай беларускай зямлі. Наша свята гатова аб'яднаць не толькі наш народ, але і ўсіх, хто блізкі нам па духу і агульных караням».

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь смуткуюць у сувязі са смерцю дэпутата Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь трынаццатага склікання, дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь першага, другога скліканняў АЗАРЧАНКАВА Аляксандра Міхайлавіча і выказваюць глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.**

БЕЛАРУСБАНК

**ОАО «АСБ Беларусбанк»**

**предлагает к реализации изолированное помещение (назначение – помещение финансового назначения) общей площадь – 149,5 кв. м, расположенное на первом этаже здания бизнес-центра «Виктория» по пр-ту Победителей, 59, пом. 3 в г. Минске.**

Обременение по сделке купли-продажи объекта – условие о заключении новым собственником с ОАО «АСБ Беларусбанк» договора аренды части изолированного помещения (ориентировочно 10 кв. м), необходимой для размещения отделения ОАО «АСБ Белаусбанк» № 514/400, в соответствии с нормами Указа Президента Республики Беларусь от 29.03.2012 №150; установка за счет средств нового собственника перегородок для выделения отделения.

Цена продажи – 606 754,08 рублей (шестьсот шесть тысяч семьсот пятьдесят четыре рубля 08 копеек) с учетом НДС.

По вопросам, связанным с объектом продажи, обращаться по телефонам: (017) 279 46 55 – Сосновский Дмитрий Викторович, (017) 279 47 74 – Баёк Павел Александрович. УНП 100325912.



БЕЛАРУСБАНК

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА по продаже изолированных помещений**

Организатор торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества – ОАО «АСБ Беларусбанк».

Наименование объектов продажи:

- лот 1 – изолированное помещение № 37 (назначение – административное помещение) общей площадью 117,3 кв. м, расположенное на 5-м этаже административно-хозяйственного здания в г. Минске, ул. Воронянского, 7А,

- лот 2 – изолированное помещение № 10 (назначение – административное помещение) общей площадью 143 кв. м, расположенное на 5-м этаже административно-хозяйственного здания в г. Минске, ул. Воронянского, 7А.

Начальная цена продажи составляет:

- лот 1 – 222 241,90 рублей (двести двадцать две тысячи двести сорок один рубль 90 копеек) с учетом НДС,

- лот 2 – 270 934,29 рублей (двести семьдесят тысяч девятьсот тридцать четыре рубля 29 копеек) с учетом НДС.

Сумма задатка:

- лот 1 – 2 222,42 рублей (две тысячи двести двадцать два рубля 42 копейки),

- лот 2 – 2 709,34 рублей (две тысячи семьсот девять рублей 34 копейки).

Открытый аукцион состоится 14.07.2021 в 11.00 по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, 69/1, актовый зал (6-й этаж).

Заявление на участие принимается в рабочие дни с 9.00 до 17.00, в пятницу – до 15.45 по 13.07.2021 включительно по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, 69/1, кабинет 602 (тел.: (017) 2794655, (017) 2794930).

Продавец – ОАО «АСБ Беларусбанк». Договоры купли-продажи заключаются и регистрируются в РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру».

По вопросам, связанным с организацией осмотра объектов продажи, обращаться по телефонам: (017) 279 46 55 – Сосновский Дмитрий Викторович, (017) 279 47 74 – Баёк Павел Александрович.

Для участия в открытом аукционе представляется заявление, к которому прилагается документ с отметкой банка, подтверждающий внесение суммы задатка по 13.07.2021 включительно на счет № BY69AKBB66708597000020000000 БИК AKBBBY2X в ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 100325912.

К заявлению также прилагаются:

юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель);

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

При подаче заявления организатором открытого аукциона с участниками заключается соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Открытый аукцион проводится путем пошагового увеличения цены. Шаг аукциона – 5 % от предыдущей названной цены. Победителем открытого аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену. Победителем аукциона возмещаются затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Договор купли-продажи по результатам проведения аукциона должен быть подписан в течение 20 рабочих дней со дня проведения открытого аукциона.


# МАГНІТНЫЯ БУРЫ — ЯК ІХ ПЕРАЖЫЦЬ?

## Якую ролю тут адыгрывае самаўнушэнне, і ці трэба аберагаць пажылых бацькоў ад дрэнных навін

**Перыядычна (даволі часта) Зямлю атакуюць магнітныя і іншыя метэанавальніцы. Расказваем, ці варта ставіцца сур'ёзна да падобных папярэджанняў (і каму асабліва важна падысці да сітуацыі з усёй адказнасцю), як сачыць за сваім арганізмам падчас негатыўных прыродных з'яў і ці можна пазбегнуць «збою».**

### ШТО Ж ГЭТА ТАКОЕ?

У магнітных бурах вінаватыя гіганцкія выкіды плазмы і зараджаных часціц на Сонцы, якія дасягаюць паверхні Зямлі прыкладна праз суткі. Пад магутным напорам зараджаных элементаў магнітнае поле Зямлі адчувае ваганні. І гэтыя ваганні адбіваюцца на самаадчуванні людзей, паколькі змяненне магнітнага поля нашай планеты мяняе і атмасферны ціск, і склад паветра. У выніку на метэаадчувальнасць скардзяцца і людзі, якія маюць хранічныя захворванні, і «практычна здаровыя».

Не адстае ва ўплыве на наша самаадчуванне і настрой, і начное свяціла. Зусім нядаўна мы перажылі «Супермесячча»: 26 мая цень ад Зямлі афарбавала яе спадарожнік барвяным, і практычна ўсе сродкі масавай інфармацыі распавялі аб Крывавым Супермесяцы. Акрамя інструкцыі, калі і дзе можна назіраць містычнае відовішча, СМІ папярэдзілі, што Месяц падыдзе да Зямлі значна бліжэй, чым звычайна, будзе поўнае месяцавае зацьменне, і трэба пасачыць за сваім здароўем.

— Магнітныя буры і іншыя глабальныя прыродныя з'явы ўплываюць у першую чаргу на самаадчуванне, а не на здароўе ў цэлым, — адзначае **галоўны герыятр Міністэрства аховы здароўя Беларусі, кіраўнік Рэспубліканскага цэнтра актыўнага даўгалецця Людміла ЖЫЛЕВІЧ.** — Ведаючы, калі чакаюцца гэтыя з'явы, іх можна прадухіліць і адчуваць сябе цалкам камфортна.

Калі вы маладыя і здаровыя, да магнітных бур вы, як правіла, зусім не адчувальныя, адзначае спецыяліст. Але ёсць людзі, першапачаткова адчувальныя да ваганняў атмасфернага ціску, магнітнага поля Зямлі і складу паветра — у іх так выбудавана сістэма барарэцэптараў, што на іх самаадчуванне ўплываюць нават нязначныя змены.

— Пэўныя прыродныя з'явы выклікаюць змены руху крыві, якія негатыўна ўплываюць, напрыклад, на самаадчуванне людзей, схільных да трамбозаў, на пацыентаў з сістэмнымі захворваннямі крыві ці сэрца. Але ім дастаткова прыняць свае звычайныя прэпараты — і спакойна перажыць гэты перыяд. Людзям з нармальным крывацёкам і здаровым сэрцам ніякіх дадатковых мер не патрабуецца.

### КАЛІ ВАШ АРГАНІЗМ — «БАРОМЕТР»

Тэрмін «метэаадчувальнасць» трывала ўвайшоў у наша жыццё. Ва ўсе часы былі людзі, якія асабліва чуйна рэагуюць на хваляванні магнітнага поля. Але ў наш час такіх людзей становіцца ўсё больш.

— Медыкі не могуць не адзначыць рост колькасці метэаадчувальных людзей, — падкрэслівае Людміла Жылевіч. — Віной таму — экалагічны фактар. Мы бачым, якія прыродныя катаклізмы адбываюцца ў свеце ў апошнія дзесяцігоддзі. Змяняецца клімат, прыроднае асяроддзе стала больш агрэсіўнае, і чалавеку дастаткова цяжка прыстасавацца да гэтага — наш арганізм разлічаны на больш «класічны варыянт».

Калі б чалавек ішоў па шляху захавання свайго здароўя, ён змог бы супрацьстаяць зменам, якія адбываюцца ў прыродзе, — у арганізма хапіла б рэсурсаў перабудавацца пад іх. Але значная колькасць сучасных людзей жыве ва ўмовах недастатковасці рухальнай актыўнасці і падтрымлівае лад жыцця, далёкі ад здаровага, кажа спецыяліст.

— Напрыклад, сур'ёзны фактар развіцця метэаадчувальнасці — курэнне. Такім чынам, чалавек сам выклікае кіслародную недастатковасць у сваім арганізме. А ў перыяд метэабур канцэнтрацыя кіслароду ў паветры зніжаецца. Плюс «уласная» кіслародная недастатковасць у курца — і арганізм адгукаецца праблемай. У першую чаргу на недахоп кіслароду рэагуюць сардэчна-сасудзістая сістэма і галаўны мозг. Апошні асабліва адчувальны да гэтага фактару — мы гэта бачым у пацыентаў з ковіднай інфекцыяй. І ў цэлым нізкая насычальнасць клетак кіслародам уплывае на ўвесь арганізм і носіць сістэмны характар. Пытанне гучыць так: калі вы малады чалавек і маеце метэаадчувальнасць, ці не прыйшоў час высветліць, што не так у вашым арганізме або з вашым ладам жыцця? Хутчэй за ўсё, вы не займаецеся сваім здароўем, у вас недастаткова фізічнай нагрузкі, вы п'яце мала чыстай вады (гэта таксама ўплывае на развіццё метэаадчувальнасці), рэдка бываеце на свежым паветры, шмат часу праводзіце за камп'ютарам і перагружаеце свой шыйны блок. Такім чынам, кіслародная недастатковасць назапашваецца і любыя перапады ціску і памяншэнне канцэнтрацыі кіслароду ў паветры ўдараюць па вашым самаадчуванні.

***— То-бок мы мяняем лад жыцця і перастаём быць метэаадчувальным?***

— У многіх выпадках — так, гэта дае вынік. Кідаем паліць, пачынаем правільна харчавацца, прыводзім у тонус мышцы (і, як вынік, сасуды таксама прыходзяць у норму) — і тады сардэчна-сасудзістая сістэма здолее добра зрэагаваць на атмасферныя змены. Але калі казаць пра людзей сталага ўзросту, іх сасудзістая сістэма ўжо менш гнуткая, сасуды больш рэгідныя, і перапады ціску для іх — большая праблема, чым для іх дзяцей і ўнукаў. Таксама ёсць прыроджаныя анамаліі, якія прыводзяць да метэаадчувальнасці. У гэтым выпадку я раіла б прайсці абследаванне і па магчымасці гэтую праблему вырашыць.



### ХТО Ў ГРУПЕ РЫЗЫКІ?

Хвароб, якія робяць нас адчувальнымі да магнітных бур, менш, чым прынята лічыць. У першую чаргу гэта хваробы сэрца і сасудаў.

— Людзі з захворваннямі сардэчна-сасудзістай сістэмы — самая ўразлівая група. Тая адзіная, якая на сто працэнтаў павінна сачыць за магнітнымі бурамі і іншымі метэаз'явамі. У такія дні яны павінны засцерагчы сябе: скарэкціраваць дозу сваіх звычайных прэпаратаў, дома ў аптэчцы або з сабой у іх падчас магнітных бур абавязкова павінны быць таблеткі для экстраннай дапамогі сэрцу або для хуткага зніжэння ціску. Калі ўзнікае складаная сітуацыя, быць да яе гатовым. Яшчэ адна група рызыкі — людзі з мігрэнямі (у гэтым выпадку таксама прысутнічае сасудзісты кампанент). І тут трэба памятаць, што мігрэні звычайна суправаджаюцца аўрай, свайго роду прадвеснікамі, і чалавеку важна быць уважлівым да свайго арганізма і спрацаваць на апераджэнне. Але гэта не значыць, што вам варта схавацца ў цёмны пакой — наадварот: мігрэнь акрамя таблетак лечыцца свежым паветрам. Адкрывайце форткі ў кватэры, а лепш выходзьце на вуліцу, свежае паветра часам купіруе галаўныя болі на этапе аўры. Тут ёсць адзін важны нюанс: некаторыя людзі рэагуюць на складаную метэаралагічную сітуацыю (тыя ж магнітныя буры) за дзень да іх. Ёсць таксама тыя, хто рэагуе і пасля «складанага» дня. Ведаючы свой арганізм, вы паспееце своечасова прыняць меры.

Яшчэ адна катэгорыя людзей, якую можна аднесці да групы рызыкі, — людзі з хваробамі апорна-рухальнага апарату, распавяла суразмоўца.

— Гэта тыя пажылыя людзі, якія заўсёды ведаюць, калі будзе дождж ці бура: напярэдадні ў іх баляць косці, суставы, застарэлыя траўмы. У складаныя «метэадні» ім важна скараціць фізічную нагрузку — хай гэта будзе больш пасіўны час.

***— Якая яшчэ бывае рэакцыя на магнітныя буры?***

— Як правіла, часцей за ўсё людзі скардзяцца на тое, што пачынае сціскаць віскі, на тупы боль у вобласці сэрца. У пажылых людзей узмацняецца адышка. Метэаадчувальныя дзеці — з'явілася і такая катэгорыя — становяцца больш раздражняльныя і хутчэй стамляюцца. У маладых людзей у такі дзень «усё валіцца з рук», не атрымліваецца сканцэнтраваць увагу, засяродзіцца. Высілкам волі гэтыя праблемы не вырашыць. Проста на такі дзень не варта многае планаваць. Лепш па магчымасці знізіць нагрузку і пачакаць, пакуль магнітная бура пройдзе. Ну і, калі гаворка ідзе пра маладых людзей, зразумела, паглядзець, які кампанент робіць вас метэаадчувальным — праблемы з сасудзістай сістэмай або асаблівасці штодзённых паводзін. І па магчымасці паклапаціцца пра сябе — паспрабаваць гэтыя фактары са свайго жыцця выключыць. У людзей маладога ўзросту ёсць вялікі рэзерв, які дазваляе пазбавіцца праблемы метэаадчувальнасці.

### У ЧАКАННІ БЯДЫ

***— А якую ролю тут адыгрывае самаўнушэнне? Нам загадзя паведамляюць аб магнітных бурах, і мы настройваемся на нездароўе...***

— Сапраўды, у сем'ях, дзе ёсць метэазалежныя людзі, ствараецца стэрэатып непазбежнасці. Людзі загадзя настройваюцца на тое, што ў гэты дзень што-небудзь абавязкова пойдзе не так. Напрыклад, маладыя людзі глядзяць на сваіх метэазалежных бацькоў і таксама становяцца метэазалежнымі — зараз ці праз некалькі гадоў. Яны сябе запраграмавалі, у іх сфарміравалася дамінанта. А наша здароўе або нездароўе залежыць, вядома, ад многіх знешніх фактараў, у тым ліку ад ладу жыцця, але шмат у чым яно — вынік работы нашага мозгу. Так што не кожны можа разумна настроіцца, даведаўшыся аб магнітнай буры.

***— А як настроіцца разумна?***

— У гэты дзень я не буду планаваць тысячы спраў, я абавязкова знайду час для прагулкі на свежым паветры, не буду перагружаць арганізм цяжкай ежай, не стану піць дзесяць кубкаў кавы і наогул паберагу сэрца. Калі я адчую, што сітуацыя ў маім арганізме змяняецца, прыму таблеткі, якія дапамогуць стабілізавацца (зразумела, калі іх прапісаў урач). Гэта разумны падыход. А знаходзіцца ў стане чакання бяды, у напрузе — падыход неразумны, і ён абавязкова дасць сімптаматыку. Такое стаўленне ўласціва людзям, якія наогул адчувальныя да інфармацыйнага поля, тым, хто знойдзе ў сябе тысячу хвароб, калі пагартае медыцынскую энцыклапедыю, а калі сусед паскардзіцца на недамаганне, адчуе болі ў тым жа месцы. У гэтым выпадку варта звярнуцца да псіхолага. Або замест чакання бяды заняцца чым-небудзь цікавым — і вы забудзецеся пра магнітную буру.

***— А ў цэлым, ці трэба імкнуцца засцерагчы пажылых бацькоў ад негатыўных навін — ад праблем у грамадстве і ў сям'і?***

— Маё меркаванне — так. Трэба берагчы вушы і сэрцы нашых бацькоў. Малады чалавек, даведаўшыся пра нешта, бурна адрэагуе, але праз пяць хвілін пераключыцца на нешта іншае. А пажылы чалавек застаецца з гэтай інфармацыяй. Ён паглыбляецца ў яе, «пераж оўвае», і ўзнікае рызыка катастрофы ў арганізме: ад уздыму ціску да інсультаў і інфарктаў. Справа ў тым, што ў сталым узросце людзі пачынаюць успрымаць інфармацыю літаральна — ім здаецца: нешта павінна здарыцца з іх блізкімі. Яны супастаўляюць прачытанае або ўбачанае са сваім жыццём, і ўжо бачаць сябе ўдзельнікамі негатыўнага працэсу. Таму інфармацыя павінна быць дазіраванай. Калі пажылы чалавек сам сядзіць у інтэрнэце, прапануйце яму акрамя яго звычайных і іншыя, больш спакойныя, сайты. Або пераканайце маму замест забаўляльнай праграмы паглядзець перадачу пра здароўе. Я не кажу, што людзей сталага ўзросту трэба ізаляваць ад інфармацыі (няхай гэта будуць катаклізмы ў свеце або складанасці ў сям'і), але падача яе павінна быць мяккай і пазітыўнай. Асноўны пасыл — мы спраўляемся, усё будзе добра.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**


**Ликвидационная комиссия РУПП «Гроднотекстиль» объявляет аукцион по продаже имущества**

| № п/п | Наименование имущества | Стоимость с НДС | Сумма задатка 10 % |
|---|---|---|---|
| 1 | Бункер пылеулавливающий б/у размерами 3730х2800х2310 мм – 8 штук | 11520,00 | 1152,00 |
| 2 | Труба из углеродистой стали д. 324*10 – 126 м б/у | 4800,00 | 480,00 |
| 3 | Труба из углеродистой стали д. 150*8 – 80 м б/у | 1104,00 | 110,40 |
| 4 | Металлоконструкции из углеродистой стали, б/у, состоящие из: швеллер 160-182 м – 6 штук, швеллер 200 – 16 м, уголок 110 – 13 м, уголок 45 – 12 м, лист 5 – 6 кв. м | 1560,00 | 156,00 |
| | ИТОГО: | 18984,00 | 1898,40 |

**Имущество находится по адресу:** г. Гродно, ул. М. Горького, 121. Торги состоятся 6 июля 2021 года в 10.00 по адресу: г. Гродно, ул. М. Горького, 121. Демонтаж производится силами покупателя.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

- копия платежного поручения о внесении на счет РУПП «Гроднотекстиль» № BY28BLBB30120500045030001001 БИК BLBBBY2X в ОАО «Белинвестбанк» г. Гродно, УНП 500048503, суммы задатка по лоту;

- копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица (индивидуального предпринимателя).

Документы должны быть представлены **до 15.00 1 июля 2021 года.** Победитель аукциона возмещает затраты по организации и проведению аукциона.

**Телефон для справок 80292858850.**



**Дукорский сельский исполнительный комитет производит (повторно) продажу однокватирных жилых домов согласно Указу Президента Республики Беларусь от 04.09.2018 г. № 357 «О пустующих и ветхих домах»**

| № п/п | Наименование | Адрес | Цена продажи бел. рублей |
|---|---|---|---|
| 1 | Объект недвижимости: капитальное строение (жилой дом) на земельном участке | Республика Беларусь, Минская область, Пуховичский район, Дукорский с/с, аг. Дричин, ул. Центральная, д. 56 | 4000,0 белорусских рублей (четыре тысячи белорусских рублей) 00 копеек |
| 2 | Объект недвижимости: капитальное строение (жилой дом) на земельном участке | Республика Беларусь, Минская область, Пуховичский район, Дукорский с/с, д. Белое, д. 17 | 2000,0 белорусских рублей (две тысячи белорусских рублей) 00 копеек |

Продажа проводится без проведения аукциона в случае поступления по истечении тридцати календарных дней со дня опубликования информации заявления на приобретение пустующего дома со стороны одного лица. С ним заключается договор купли продажи жилого дома. Заявления принимаются **по 05 июля 2021 года** по адресу: 222840, ул. Речная 14, аг. Дукора Пуховичского района Минской области.

**Телефоны для справок: (8-01713) 63935, 99-436.**

Эл/почта: dukorselisp@tut.by, dukorselisp@pukhovichi.gov.by

При наличии нескольких претендентов на приобретение пустующего дома его отчуждение будет осуществляться по результатам аукциона.

УНП 600177864



Утерянные страховые полисы по добровольному страхованию от несчастных случаев на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БМ № 1340958 – 1340970 филиала СООО «Асоба» в г. Минске № 2 **считать недействительными.**

УНП 100706519



**Извещение о проведении 06 июля 2021 года торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»**

| Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе) | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| № | Наименование | Инв. номер | Местонахождение | Начальная цена в бел. руб. без НДС | Размер задатка в бел. руб. |
| 1 | Зуборезный полуавтомат мод. 5С280П, год выпуска – 1980 | 4220704 | г. Минск, ул. Социалистическая, 2 | 102 001,18 | 10 200,00 |
| 2 | Зуборезный полуавтомат мод. 5С280П, год выпуска – 1980 | 4220705 | | 58 313,44 | 5 800,00 |
| 3 | Зуборезный полуавтомат мод. 5С280П, год выпуска – 1980 | 4220957 | | 65 246,65 | 6 500,00 |
| 4 | Зуборезный полуавтомат мод. 5С280П, год выпуска – 1982 | 4223728 | | 59 426,88 | 5 900,00 |
| 5 | Зуборезный полуавтомат мод. СТ280.009, год выпуска – 1990 | 4232298 | | 68 204,71 | 6 800,00 |
| 6 | Зуборезный полуавтомат мод. СТ280.009, год выпуска – 1988 | 4229898 | | 52 200,00 | 5 200,00 |

**Продавец имущества:** ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», ул. Социалистическая, 2, 220021, г. Минск.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

Приз 2 считается переданным Победителю с момента их отправки на адрес электронной почты Победителя, указанный им при регистрации на Интернет-сайте Рекламной игры.

Приз 3 и Главный приз считаются переданными Победителю с момента подписания Победителем Акта приема-передачи Приза.

В случае если Победитель не может получить Приз 3 или Главный Приз лично, данные призы может получить его доверенное лицо при предъявлении документа, удостоверяющего личность, и доверенности, выданной в порядке, определенном законодательством Республики Беларусь.

**13. Комиссия по проведению Рекламной игры «Играй с Бонаква!»**

Для контроля соблюдения Правил Рекламной игры, для контроля формирования Списков Игровых кодов, утверждения результатов и их отражения в Протоколах еженедельных розыгрышей, подведением итогов по результатам проведения Рекламной игры, рассмотрением спорных случаев, принятием решений по устным и письменным жалобам и замечаниям, возникшим при проведении Рекламной игры, Организатор создает Комиссию по проведению Рекламной игры в следующем составе:

Председатель Комиссии — Лейкина Карина Александровна, ООО «Пиар Куб», управляющий.

Члены комиссии:

1. Нахайчук Светлана Геннадьевна, ООО «Пиар Куб», менеджер по реализации проектов;
2. Фалькович Наталья Николаевна, ООО «Пиар Куб», главный бухгалтер;
3. Мартынова Полина Леонидовна, ООО «Пиар Куб», бухгалтер;
4. Мартинович Роман Дмитриевич, ООО «Пиар 3 Коннект», редактор-технический.

**14. Информация о Рекламной игре «Играй с Бонаква!», публикация Правил Рекламной игры «Играй с Бонаква!».**

Правила Рекламной игры подлежат опубликованию в газете «Звязда» до начала Рекламной игры.

Результаты Рекламной игры будут опубликованы в газете «Звязда» в срок по 15 сентября 2021 г. включительно.

Информацию о правилах и условиях участия в Рекламной игре можно получить на Интернет-сайте Рекламной игры www.bonaqua.by, а также по телефону информационной линии: +375 (29) 308-19-61 с понедельника по пятницу с 12.00 до 19.00, в субботу с 12.00 до 16.00 (стоимость звонка тарифицируется в соответствии с тарифами мобильного оператора, услугами которого пользуется Участник).

**15. Прочие условия**

15.1. Принимая участие в Рекламной игре, Участники соглашаются на передачу своих персональных данных, в том числе ФИО, номера телефона, электронной почты, адреса места регистрации, Организатору и (или) заинтересованным лицам, а также «Приорбанк» ОАО (для целей обеспечения возможности участия Участников в Рекламной игре, а также получения Призов.

Участие в Рекламной игре предполагает ознакомление и полное согласие Участников с настоящими Правилами и принятие на себя обязательства соблюдать все их условия и требования.

Факт участия в Рекламной игре означает, что ее Участники соглашаются с тем, что их имена, фамилии, отчества, фотографии, видео-, аудио- и иные материалы о них могут быть использованы Организатором в любых рекламных и (или) информационных материалах, связанных с проведением Рекламной игры, без уплаты какого-либо вознаграждения Участникам. Победитель Розыгрышей дает свое согласие на интервью в средствах массовой информации и съемку для рекламных материалов, подготовленных в связи с проведением данной Рекламной игры, без выплаты ему какого-либо вознаграждения. Все права на такие рекламные материалы принадлежат Организатору.

Организатор не несет ответственности за работу сети Интернет (например, плохое соединение с провайдером, поломки в сети и т. д.).

Организатор не несет ответственности за невозможность связаться с Победителями в случае недостоверной информации, предоставленной Участником.

Споры между Организатором и Участниками Рекламной игры рассматриваются согласно законодательству Республики Беларусь.

Все возможные претензии Участников Рекламной игры в отношении организации Рекламной игры должны быть адресованы Организатору игры по адресу: Республика Беларусь, 220030, г. Минск, а/я 196.

*Свидетельство № 3998 о государственной регистрации Рекламной игры, зарегистрированной 27 мая 2021 г., выданное Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.*


БЕЛАРУСБАНК

**ОАО «АСБ Беларусбанк» объявляет о проведении открытого аукциона по продаже объекта недвижимого имущества методом повышения начальной цены (шаг – 10 %):**

| № лота | Характеристика имущества | Местонахождение имущества | Начальная цена |
|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение (назначение/наименование: здание специализированное финансового назначения) с инвентарным номером 222/С-13593, общей площадью: 323,2 кв. м | Витебская обл., г. Поставы, ул. 17 Сентября, 96В | 208 200,00 (двести восемь тысяч двести рублей 00 копеек), в т. ч. НДС по ставке 20 % – 34 700,00 (тридцать четыре тысячи семьсот рублей 00 копеек) |

Организатор торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества – Витебское областное управление № 200 ОАО «АСБ Беларусбанк».

Заявление на участие принимаются по адресу: г. Витебск, ул. Ленина, 10б, кабинет 0.1 в срок до 16.00 06.07.2021.

Юридические лица, индивидуальные предприниматели, физические лица, подавшие заявления на участие в аукционе, перечисляют задаток в размере 5 % от начальной цены лота в срок до 12.00 06.07.2021 на расчетный счет BY69 AKBB 6670 8597 0000 2000 0000, открытый в ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 100325912, назначение платежа – задаток для участия в аукционе.

Аукцион состоится 08.07.2021 в 11.00 по адресу: г. Витебск, ул. Ленина, 10б, первый этаж, актовый зал.

Особые условия: победителем аукциона возмещаются затраты на организацию и проведение аукциона в размере расходов, связанных с публикацией извещения в СМИ. Покупатель дополнительно возмещает расходы по оценке имущества (657,36 руб. с НДС). Дополнительно победитель аукциона приобретает объекты основных средств по стоимости 1 247,31 руб. (в т. ч. НДС 20 %): каскадная система КС-2-32, приточная установка вентсистем SPS, теплосчетчик ТЭМ-102-2, кондиционер TADIRAN GTM24H.

Организатор аукциона вправе отказаться от его проведения не позднее чем за три рабочих дня до даты наступления даты его проведения.

Срок подписания договора купли-продажи предмета аукциона победителем не позднее 30 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов.

**Необходимую информацию по вопросам участия в аукционе можно получить по телефонам: (0212) 20-48-55, 8 (029) 309-42-19.**

**ОАО «Гомельоблреклама»**

**филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельоблстрой» (продавец) в лице антикризисного управляющего в деле о банкротстве Колеснева Н. М. извещает о проведении 18 июня 2021 года открытого повторного аукциона со снижением начальной цены на 90 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж**

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб. | Шаг аукциона – 5 %, бел. руб. | Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| **Условие продажи:** 1. Претендент на покупку (победитель) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. 2. В соответствии с действующим законодательством РБ (в части изменения подпункта 2.30 пункта 2 статьи 115 в Налоговом кодексе РБ с 1 января 2019 года) реализация имущества осуществляется без учета НДС 20 % | | | | |
| **1** | **Пожарная сигнализация, инв. № 32(ж)** | **970,00** | 48,50 | 97,00 |

**Продавец:** ОАО «Гомельоблстрой», г. Гомель, ул. Малайчука,12. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактным тел.:** 8 (029) 185-37-18 – управляющий в деле о банкротстве Колеснев Николай Михайлович; 8 (044) 769-19-61, 8 (0232) 53-27-62 – по недвижимости – Яроцкая Людмила Николаевна. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. Для участия в аукционе необходимо:** 1. Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «Гомельоблстрой»):** р/с BY73 BLBB 3012 0400 0516 9300 1001, в Головной ф-л по Гомельской области ОАО «Белинвестбанк», БИК BLBBBY2X, УНП 400051693, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); 2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 7 июня 2021 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 16 июня 2021 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за **5 (пять) дней** до его проведения. **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником** (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %.** Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается Продавцом в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента его подписания и возместить затраты и расходы на организацию и проведение аукциона в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» «О порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части)», и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-З (ред. от 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)», ст. 127–129. **Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 25.11.2020 г. № 230 (29344). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы» и www.bankrot.gov.by. Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 126-66-62.**

**Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

**извещает о проведении 06 июля 2021 г. в 11.00 открытого аукциона по продаже объекта недвижимости – производственного помещения с инв. № 350/D-182543, принадлежащего Открытому акционерному обществу «Гродненский стеклозавод» на праве собственности**

**Лот № 1: производственное помещение, инв. № 350/D-182543.** Адрес объекта: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Лепешинского, 7-3. Назначение: производственное помещение. Общая площадь 7 974,5 кв. м. Изолированное нежилое помещение расположено в одноэтажном здании с инв. № 350/С-50677, 1970 года постройки.
Принадлежности: автодорога, тротуар асфальтобетонный

**Начальная цена лота: 2 050 800,00 руб.** (в т. ч. НДС по ставке 20 %). **Задаток: 20 508,00 руб.** (в т. ч. НДС по ставке 20 %)

**Земельный участок** для обслуживания зданий, в одном из которых расположено помещение, на праве аренды (доля в праве аренды 4323/10000) площадью 3,5631 га с кадастровым номером **340100000002003191.** Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

Шаг аукциона – 5 %. Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артема, 23, каб. 1.1. Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: г. Гомель, ул. Артема, 23, 2-й этаж, каб. 2-6 по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 05 июля 2021 г. включительно.** Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.
В аукционе имеют право участвовать юридические и физические лица, а также индивидуальные предприниматели, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявляемому лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 10.00 до 11.00 06 июля 2021 г. Аукционные торги проводятся в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов, утвержденным Организатором торгов.
Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить Объект по начальной цене, увеличенной на 5 %.
**При подаче заявления участник должен иметь:** 1) копию платежного документа с отметкой банка, подтверждающего внесение задатка для участия в аукционе; 2) физическое лицо – паспорт; представитель физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность; представитель юридического лица (резидента РБ) – паспорт (руководитель – копию документа о назначении на должность), доверенность на участие в аукционе и подписание документов, копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица и их подлинники для заверения их копий организатором аукциона; представитель юридического лица (нерезидента РБ) – легализованные в установленном порядке доверенность на участие в аукционе и подписание документов (руководитель – копию документа, подтверждающего назначение на должность), копии учредительных документов и выписку из государственного (торгового) реестра юридических лиц страны происхождения (выписка должна быть датирована не позднее шести месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на белорусский (русский) язык. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть.
Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на **р/с BY49AKBB30120000101350000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гомель, БИК AKBBBY2X. Получатель платежа – Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». УНП 401166490. Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе по лоту № 1 согласно извещению в газете «Звязда» от 05.06.2021 г.
Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшими победителем (лицом, приравненным к победителю), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объекта. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими победителями аукциона (лицом, приравненным к победителю), Организатор торгов возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.
**Победитель торгов (лицо, приравненное к победителю) обязан:** в течение 3 рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона уплатить Организатору аукциона вознаграждение по результатам аукциона в размере 1% от окончательной цены продажи Объекта; в течение 20 календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта; в сроки согласно заключенному договору купли-продажи выплатить Продавцу стоимость Объекта, сформированную в установленном порядке. Если между Продавцом и Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи Объекта, не будет достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты Объекта, такая оплата должна быть произведена в течение 30 календарных дней с момента заключения договора купли-продажи Объекта

**Организатор: Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гомель, ул. Артема, 23. тел.: 8 (0232) 32-46-47; 32-18-95; 8 (029) 170-46-47. сайт: gino.by • e-mail: auction-gino@gino.by**
**Продавец: ОАО «Гродненский стеклозавод», г. Гродно, ул. Суворова, 40. тел. 8 (0152) 39-91-53, 8 (044) 513-41-31.**

К@нтыненты

# МЁРТВЫ СЕЗОН

## Чаму Мексіку накрыла хваля гвалту?

**Заўтра ў Мексіцы пройдуць выбары. Цяперашнюю кампанію па праве называюць самым маштабным электаральным працэсам у сучаснай гісторыі дзяржавы. Жыхары краіны абяруць больш за 20 тысяч чыноўнікаў на розных узроўнях, у тым ліку 15 губернатараў, 500 федэральных і 1063 рэгіянальныя дэпутаты, а таксама кіраўнікоў 1926 муніцыпалітэтаў у 30 штатах — гэта тры чвэрці мясцовых кіраўнікоў. З восені мінулага года Мексіку накрыла крывавая хваля гвалту супраць палітыкаў. Па меншай меры каля 90 дзеячаў розных узроўняў забітыя, з пагрозамі сутыкнуліся яшчэ звыш 700. На кандыдатаў нападаюць пасярод дня, пагражаюць расправай, у тым ліку падкідваюць адсечаныя свіныя галавы. Аб гэтым паведаміла CNN са спасылкай на даныя мексіканскай кансалтынгавай фірмы Etellekt Consultores. Па словах яе дырэктара Рубэна Салазара, гэтая выбарчая кампанія ў Мексіцы стане рэкорднай па колькасці ахвяр. Чаму так адбываецца, чаго чакаць надалей?**

### Раскрывальнасць — 10 працэнтаў

Адным з гучных інцыдэнтаў жудаснага «мёртвага сезона» перад выбарамі ў Мексіцы стала забойства экс-пракурора Абеля Мур'еты ў горадзе Кахеме: мужчыну расстралялі з аўтамабіля ў цэнтры горада, проста падчас сустрэчы з выбаршчыкамі, паведаміла La Radio del Sur. Тое, што адбылося, актыўна абмяркоўвалася ў сацыяльных сетках, асабліва ў прывязцы да праграмы кандыдата, які называў барацьбу са злачыннасцю сваёй галоўнай задачай і абяцаў супрацьстаяць распаўсюджванню наркотыкаў. «Хопіць наркотыкаў, якія крадуць нашых дзяцей і руйнуюць нашы сем'і. Я чалавек закона. Мае рукі не дрыжаць. Я не баюся», — заявіў Мур'ета ў адным з праграмных зваротаў, які быў апублікаваны ўсяго за суткі да забойства палітыка.

Яшчэ адной ахвярай стала Альма Раса Бараган, яна балаціравалася на пасаду мэра Маралеона, горада ў штаце Гуанахуата. Як паведаміла CNN, сітуацыя ў рэгіёне, з пункту гледжання ўзроўню злачыннасці, адна з самых складаных у краіне. Кандыдата на пасаду мэра застрэлілі таксама падчас перадвыбарчага выступлення напрыканцы мая.

Улады Мексікі ўжо займаюцца расследаваннем не толькі гэтых інцыдэнтаў, але і іншых нападаў на кандыдатаў. Аднак пакуль паліцыі не ўдалося затрымаць злачынцаў. Паводле ацэнак мясцовых СМІ, узровень раскрывальнасці злачынстваў у краіне складае ўсяго каля 10 працэнтаў. Як падкрэсліў старшы аналітык Міжнароднай крызіснай групы па Мексіцы Фалька Эрнст, злачынныя групоўкі засвоілі ўрок апошніх некалькіх гадоў — незалежна ад таго, што яны здзяйсняюць, у тым ліку забойствы кандыдатаў ці напады на дзяржаўныя ўстановы — ніякіх наступстваў не будзе. «Калі мы паглядзім на эфектыўнасць мексіканскіх судоў у раскрыцці забойстваў палітыкаў, то яна практычна роўная нулю. Такая сітуацыя дае бандам упэўненасць у тым, што, забіваючы кандыдатаў, яны змогуць пазбегнуць пакарання за гэтыя злачынствы», — цытуе яго The Guardian.

### Вайна картэляў

Як адзначаюць эксперты, цэнтрам наркабізнесу ў Лацінскай Амерыцы і асноўным замежным пастаўшчыком какаіну ў ЗША на працягу дзесяцігоддзяў з'яўляецца Мексіка. Наркабізнес мае разгалінаваную міжнародную сетку, якая выкарыстоўваецца ў тым ліку і для легалізацыі сродкаў, атрыманых злачынным шляхам.

Злачынныя групоўкі ў Мексіцы змагаюцца за сферы ўплыву, вядуць сапраўдную вайну з сілавікамі. І прымяняюць для нападаў найноўшыя тэхналогіі. Так, у красавіку ў мексіканскіх штатах Мічаакан, Халіска і Гуанахуата паліцэйскіх і салдат атакавалі з дапамогай дронаў, якія былі начынены ўзрыўчаткай. У выніку пацярпелі прадстаўнікі сіл бяспекі, заявіў на прэс-канферэнцыі міністр нацыянальнай абароны Луіс Крэсенсія Сандаваль.

Улады штата Мічаакан мяркуюць, што за атакай стаіць картэль «Новае пакаленне Халіска», адна з нядаўна створаных і найбольш прагрэсіруючых злачынных груповак краіны. Па словах Сандаваля, затрыманы мужчына, які кіраваў дронамі. Праваахоўнікі лічаць, што гэта найноўшая зброя ў барацьбе картэляў з арміяй, паліцыяй і ўзброенымі групамі мясцовых жыхароў.

Сілавікі, на якіх напалі, расчышчалі дарогу да горада Агілілля. Раней картэлі заблакіравалі яе грузавікамі і перакапалі, каб перашкодзіць дабрацца да горада. Злачынныя групоўкі і праваахоўнікі вядуць зацяжную вайну за кантроль над населеным пунктам. Таксама «Новае пакаленне Халіска» змагаецца з бандай, якая называе сябе «Аб'яднаны картэль». Паводле даных газеты El Milenio, з-за крывавага процістаяння адсюль да пачатку мая збеглі каля 1,5 тысячы мясцовых жыхароў. У Агілілі нарадзіўся лідар картэля «Новае пакаленне Халіска» Нэмэсі Асегуэра Сервантэс па мянушцы Эль Менча. Гэта адзін з самых адшукваных людзей у Мексіцы. Амерыканскае агенцтва па барацьбе з наркотыкамі прапануе за інфармацыю, якая прывядзе да яго арышту, 10 мільёнаў долараў. Картэль Эль Менча — адзін з самых уплывовых і жорсткіх у краіне. Ён арганізоўвае самыя жорсткія нападзенні на мексіканскіх сілавікоў, у прыватнасці засада ў штаце Халіска, у якой загінулі 15 праваахоўнікаў. Таксама лічыцца, што гэтая групоўка стаіць за дзёрзкай спробай забойства шэфа паліцыі Мехіка Амара Гарсія Арфуча. Лічыцца, што картэль зрабіў больш жорсткімі свае набегі на салдат і паліцыю ў адплату за экстрадыцыю ў ЗША сына Эль Менча, Рубэна Асегуэра Гансалеса, вядомага як Менчыта, або «малы Менча».



Людзі проста ў адчаі. У сярэдзіне мая шматтысячны марш памяці ахвяр арганізаванай злачыннасці прайшоў у Гвадалахары, сталіцы штата Халіска. Пра гэта паведаміла газета Milenio. Удзельнікі шэсця, у тым ліку студэнты і прадстаўнікі грамадскіх арганізацый, заклікалі ўлады расследаваць выкраданне і забойства траіх членаў сям'і Гансалес Марэна, а таксама высветліць лёс больш чым 12 тысяч зніклых без вестак у рэгіёне да цяперашняга часу. «Мы зноў выйшлі на вуліцы, каб запатрабаваць справядлівасць, — заявіў, звяртаючыся да прысутных, рэктар Гвадалахарскага ўніверсітэта Рыкарда Вільянуэва. — Мы наладзілі шэсце, каб сказаць, што мы не можам змірыцца з гвалтам».

### Фактар сілы

Апроч высокага ўзроўню злачыннасці, на агульную сітуацыю ўплывае бяздзейнасць федэральнага ўрада ў вырашэнні рэгіянальных праблем і адсутнасць у яго дастатковых для гэтага рэсурсаў, расказаў РІА «Навіны» эксперт Цэнтра аналізу бяспекі і дэмакратыі, кансультант па пытаннях нацыянальнай бяспекі і разведкі Карлас Радрыгес Уёа.

«У Мексіцы адзначаны розныя формы гвалту, якія шырока распаўсюджваюцца з-за беспакаранасці. У сітуацыі надыходзячых выбараў праяўляецца палітычны гвалт, а федэральная ўлада сваім бяздзеяннем падае сігнал, што многія з гэтых злачынстваў неабавязкова ўсур'ёз праследаваць — па меры таго як яна пазбягае адказнасці, мясцовыя гульцы атрымліваюць стымул вырашаць рознагалоссі пры дапамозе гвалту», — заявіў Радрыгес Уёа.

Апроч фізічнай ліквідацыі палітычных канкурэнтаў, усё большае распаўсюджванне, па словах эксперта, атрымліваюць іншыя формы гвалту — выкраданні, вымагальніцтвы і нападзенні на маёмасць. У асноўным яны выкліканы проціборствам мясцовых канкурыруючых палітыка-эканамічных груп, але ў кантэксце выбараў у барацьбу ўключаюцца і злачынныя арганізацыі.

Крымінальныя структуры Мексікі імкнуцца завязаць адносіны з мясцовай уладай, якая адыгрывае важную ролю ў арганізацыі незаконнага абароту наркотыкаў або іншых формаў арганізаванай злачыннасці, — з муніцыпальнай паліцыяй і членамі адміністрацый. «Без сумненняў, на мясцовым узроўні арганізаваныя злачынныя групы з'яўляюцца суб'ектам улады. Любы выбарчы працэс — гэта кан'юнктура для перагрупоўкі сіл на месцах, і адно з тлумачэнняў палітычнага гвалту заключаецца ў тым, што арганізаваныя злачынныя групы становяцца больш актыўным гульцом і фактарам сілы на мясцовым узроўні. У залежнасці ад рэгіёна дамінуе тая ці іншая група», — лічыць Радрыгес.

Генеральная пракуратура Мексікі ў 2018 годзе пачала працэс поўнай рэарганізацыі з мэтай набыцця аўтаноміі і незалежнасці ад дзяржавы, і гэты працэс дагэтуль не завершаны. «Працэс стварэння гэтага інстытута працягваецца. Я маю на ўвазе, што ў іх усё яшчэ няма ўсіх належных рэсурсаў, неабходнага ахопу і неабходных кадраў, і насамрэч яны робяць усё, што могуць, выкарыстоўваючы наяўныя бедныя рэсурсы. Мы маем вельмі абмежаванае дзяржабвінавачванне», — падкрэсліў эксперт.

Важны фактар, які, на думку Радрыгеса, перашкаджае эфектыўнаму расследаванню злачынстваў, — моцная раз'яднанасць улад на федэральным, рэгіянальным і муніцыпальным узроўнях — у такіх умовах удзел дзяржавы як дзейснага боку практычна не адчуваецца, што дазваляе мясцовым гульцам атрымліваць адабрэнне і накіроўваць дзеянні ў сваіх інтарэсах. «Федэральны ўрад у такіх умовах не імкнецца адыгрываць больш істотную ролю (на мясцовым узроўні. — **Рэд.**), і мы маем такія наступствы. Дзяржава — гэта рэферы, і калі яна вырашае не выконваць гэтую функцыю, бяздзейнічае, відавочна, што ўдзельнікі канфліктаў павышаюць узровень гвалту», — упэўнены Радрыгес Уёа.

### Цяжкі час

Мексіканскія выбары часта суправаджаюцца расправамі з палітыкамі. Напрыклад, напярэдадні галасавання 2015 года больш за 60 кандыдатаў розных узроўняў былі забіты па ўсёй краіне. Часта за такімі злачынствамі стаяць прадстаўнікі злачынных груповак, звязаных з наркакартэлямі.



Як заявіў кіраўнік Etellekt Consultores Рубэн Салазар, у гэтым годзе большасць ахвяр былі кандыдатамі на пасады мэра ад партый, якія супрацьстаяць дзеючым уладам у гэтых штатах. На яго думку, іх смерць сведчыць аб глыбокіх сувязях паміж арганізаванай злачыннасцю і рэгіянальнымі ўрадамі, якія яе абараняюць. «Калі вы сутыкняцеся з імі, вас запалохаюць або заб'юць. Гэта мексіканская дэмакратыя на мясцовым узроўні. Ніхто не можа балаціравацца без дазволу мэра і мясцовага крымінальнага аўтарытэту», — заўважыў Салазар, дадаўшы, што прэзідэнт краіны Андрэс Мануэль Лопес Абрадор не жадае змагацца з наркакартэлямі.

Запалохванне кандыдатаў — адзін з заўважных фактараў ва ўмовах цяперашняй кампаніі. Паводле папярэдніх даных, як мінімум 16 чалавек адмовіліся ад удзелу ў выбарах з-за праследу або пагроз. Напрыклад, апазіцыйны палітык Крысціна Дэльгада не стала балаціравацца на пасаду мэра горада Оахака пасля таго, як невядомы адправіў ёй адсечаную галаву свінні і ліст з пагрозамі.

Пры гэтым прэзідэнт Абрадор тры гады таму прыйшоў да ўлады з абяцаннем змяніць Мексіку да лепшага, лічачы дзейсным спосабам барацьбы са злачыннасцю вырашэнне асноўных праблем краіны, у прыватнасці беднасці, каб даць людзям магчымасць не ісці наймацца ў картэлі. Аднак пакуль гэтая стратэгія не прынесла станоўчага выніку, улады сцвярджаюць, што неабходна больш часу для яе рэалізацыі.

На адной з прэс-канферэнцый напрыканцы мая мексіканскі прэзідэнт прызнаў, што на дадзены момант у краіне «цяжкі час» для перадвыбарчых кампаній, але паабяцаў, што будзе рабіць усё для абароны кандыдатаў і дамагацца справядлівасці для ахвяр. Бягучую сітуацыю прэзідэнт спісаў на разбуральнае ўздзеянне карупцыі ў мінулых урадах дзяржавы, што з'яўляецца прычынай для распальвання гвалту ў краіне. Ён таксама заўважыў, што ўлады аказалі абарону амаль 150 кандыдатам у розных штатах і разглядаюць каля 400 скаргаў на праследы.

Аднак, як піша The Guardian, з-за выбухаў гвалту перадвыбарчую кампанію прыйшлося прыпыніць у дзясятках муніцыпалітэтаў па ўсёй краіне. У прыватнасці, так паступіла кіруючая партыя «Рух нацыянальнага адраджэння» ў паўднёвай частцы штата Мехіка — самым густанаселеным рэгіёне краіны. Як заявіў gazeta.ru кіраўнік Цэнтра палітычных даследаванняў Інстытута Лацінскай Амерыкі РАН Збігнеў Іваноўскі, у Мексіцы традыцыйна вельмі высокі ўзровень гвалту, ён звязаны з наркатрафікам. Так, у 2020 годзе па колькасці наўмысных забойстваў (40,5 тысячы) гэтая краіна саступала толькі Бразіліі, а па колькасці забойстваў на 100 тысяч насельніцтва — Венесуэле і Гандурасу. Прычым з 2015 да 2020 года адпаведны паказчык вырас з 13 да 27 — больш чым удвая. Летась у Мексіцы, паводле афіцыйных даных, было здзейснена 34,5 тысячы наўмысных забойстваў — фактычна на тым жа ўзроўні (толькі на 0,4 працэнта менш), што і ў рэкордным па смерцях 2019-м.

«Цяперашняму прэзідэнту гэта дасталося ў спадчыну ад мінулай улады, сітуацыя працягвае заставацца досыць складанай. На жаль, з ёй пакуль ніхто не здолеў справіцца. Змагацца з наркамафіяй спрабавалі па-рознаму, у тым ліку сілавымі метадамі або з дапамогай тайных дамоў. Дзейнаму прэзідэнту, які таксама спрабуе прыняць нейкія меры, не ўдаецца змяніць сітуацыю», — падкрэсліў эксперт. У выніку можна прагназаваць некаторае пагаршэнне пазіцый кіруючага «Руху нацыянальнага адраджэння», рэзюмаваў Іваноўскі. Паводле звестак сацыялагічных апытанняў, прыхільнікі прэзідэнта атрымаюць адносную, але не абсалютную большасць месцаў — у межах 40 працэнтаў.

**Захар БУРАК.**

# Усходні гараскоп на наступны тыдзень



**АВЕН.** Прычынай няўдач на гэтым тыдні можа стаць ваша залішняя даверлівасць. Інфармацыю варта правяраць. Зоркі кажуць, што вы занадта доўга паводзілі сябе добра, час даць выхад унутранай напрузе, але зрабіць гэта трэба так, каб ніхто з навакольных не пацярпеў. Не перашкодзіць павышаная ўвага да спраў дзяцей у выхадныя дні.



**ЦЯЛЕЦ.** На гэтым тыдні адным з важных пытанняў стане ўзгадненне з работадаўцам аб'ёму працы. Час задумацца пра адпачынак. Другая палова тыдня можа быць напоўнена дробнымі справамі, паведамленнямі, лістамі. У пятніцу парады добразычліўцаў пагражаюць пасыпацца на вас, як з рога багацця — пажадана звяртаць на іх менш увагі.



**БЛІЗНЯТЫ.** Падобна на тое, надышоў момант, калі варта змяніць нешта важнае і істотнае. Прыслухайцеся да голасу інтуіцыі і канчаткова вырашыце, у якім кірунку і з кім вы хочаце ісці па жыцці далей. Менавіта цяпер вашы жаданні выконваюцца, і закладваецца аснова будучыні.



**РАК.** На гэтым тыдні вы можаце выявіць у сябе новыя здольнасці. Будзьце цярплівыя, нават калі вас будуць правакаваць на канфлікт. У гэтыя дні сітуацыяй, падобна, будуць кіраваць іншыя, вам жа не варта заўзята адстойваць свае правы. Затое вашы інтарэсы будуць улічаны ў пятніцу. У нядзелю парадуюць зносіны з дзецьмі.



**ЛЕЎ.** Пачатак тыдня абяцае быць даволі клапотным, аднак да выхадных усе ўляжыцца, і вы зможаце паўнавартасна адпачыць у добрай кампаніі, верагодна, за горадам. У панядзелак вас можа чакаць раздражняльнае мноства непатрэбных кантактаў. Будзьце больш абачлівыя ў выказваннях: навакольныя могуць аказацца залішне ўспрымальныя да вашых слоў, нават калі ў планы не ўваходзіла кагосьці пакрыўдзіць.



**ДЗЕВА.** Вы цяпер у цэнтры ўвагі, правільны падыход да справы і ўпэўненасць у сваіх сілах забяспечаць поспех. Памятайце: хто не рухаецца наперад, той коціцца назад. Але з далёкімі паездкамі лепш усё ж пачакаць. Верагодныя творчыя азарэнні, прыслухоўвайцеся да інтуіцыі, яна падкажа дакладнае рашэнне ў асабістым жыцці. Ваша красамоўства будзе арганічна спалучацца з абаяннем — зможаце многім спадабацца.



**ШАЛІ.** Для дасягнення мэт засталося прыкласці зусім трохі намаганняў, і атрымаеце чаканы вынік. Серада — адзін з самых удалых дзён тыдня. Час ажыццявіць самыя смелыя задумы. У пятніцу пад ціскам абставінаў ваш пункт гледжання можа змяніцца, і хай вас не бянтэжыць, што хтосьці будзе адчуваць з-за гэтага нязручнасці. Выхадныя — выдатны момант для сустрэчы з сябрамі і для цёплых зносін.



**СКАРПІЁН.** Паступова ўзрастае ваш аўтарытэт у прафесійнай сферы, з'явіцца пастаянная крыніца даходу, прычым салідная, так што ваш дабрабыт значна вырасце. Але паспрабуйце не ўзвальваць на свае плечы чужыя праблемы, асабліва калі гэтыя людзі выклікаюць у вас не самыя прыемныя пачуцці. А вось любімаму чалавеку трэба дапамагчы. Гэта стане ключом да вашага агульнага шчасця.



**СТРАЛЕЦ.** Надыходзіць час рашучых дзеянняў. Чакаецца выдатны, яркі, насычаны тыдзень. У вас будзе практычна ўсё атрымлівацца. Здолееце добра зарабіць. Але калі прысвяціце тыдзень адпачынку, то многія з вашых ідэй, на якія ніколі не хапала часу, могуць нарэшце ўвасобіцца ў жыццё. У суботу лепш не пачынаць новых спраў. У нядзелю паспрабуйце адпачыць на прыродзе.



**КАЗЯРОГ.** Гэты тыдзень, хутчэй за ўсё, прыйдзецца цалкам прысвяціць працы. Вельмі шмат трэба зрабіць, каб думаць пра адпачынак. У аўторак пастарайцеся быць больш стрыманымі і сачыць за тым, што і каму кажаце. У чацвер не варта дарэмна расходаваць свае сілы — устрымайцеся ад мітусні і балбатлівасці. У гэты дзень лепш разумна знізіць аб'ём працы. Ініцыятыва, якая праявілася ў пятніцу, будзе годна ацэнена.



**ВАДАЛІЎ.** Неабдуманыя дзеянні на гэтым тыдні катэгарычна недапушчальныя. Нават у дробязях і ў тых выпадках, калі вы дзейнічаеце па звычцы. Не варта ісці на павадзе ў эмоцый. Калі розум раіць спыніць адносіны, прыслухайцеся. Ідэі, якія наведалі вас у сярэдзіне тыдня, няхай іх і немагчыма рэалізаваць на дадзены момант, вартыя таго, каб скарыстацца імі ў далейшым. У найбліжэйшай будучыні яны могуць прынесці прыбытак.



**РЫБЫ.** На гэтым тыдні вы, мабыць, будзеце схільныя старацца дагадзіць усім і адразу. Імкненне пахвальнае, але, каб яго рэалізаваць, нечымі інтарэсамі давядзецца ахвяраваць, і добра было б, каб не вашымі ўласнымі. У аўторак не варта згаджацца на занадта прывабныя прапановы: у іх будзе падвойнае дно. У выхадныя, каб не ўскладняць адносіны з блізкімі, давядзецца пайсці на саступкі і перагледзець свае некаторыя прынцыпы.

Даты | Падзеі | Людзі

**5 ЧЭРВЕНЯ**




**1854** год — нарадзіўся Юдэль Пэн, беларускі жывапісец, педагог. У 1885 годзе скончыў Пецярбургскую акадэмію мастацтваў. З 1891-га жыў у Віцебску, дзе стварыў Віцебскую школу-майстэрню, у 1918—23 гадах кіраваў майстэрняй у Віцебскім народным мастацкім вучылішчы. Працаваў пераважна ў жанры кампазіцыйнага партрэта, а таксама пейзажу, тэматычнай карціны. У творчасці развіваў традыцыі перасоўнікаў. У сваіх работах звяртаўся да адлюстравання гарадскога побыту. Сярод карцін — «Вуліца ў Віцебску», «Стары салдат», «Майстар гадзіннікаў» і інш.

**1821** год — 200 гадоў таму нарадзіўся (мястэчка Радашковічы) Юльян Гарайн, пісьменнік, падарожнік. Скончыў Мінскую гімназію. Вучыўся ў Маскоўскім універсітэце. У 1840—50-я гады жыў у Мінску. Сябраваў з В. Дуніным-Марцінкевічам. На пастаноўку яго «Ідыліі» адгукнуўся артыкулам «Фізіялогія прымавак», апублікаваным у газеце «Варшаўскі дзённік». Аўтар успамінаў пра У. Сыракомлю «З жыцця паэта», дзе падрабязна апісаў знаходжанне паэта ў Мінску. У 1870-я гады жыў у ЗША, дзе сустракаўся з Г. Сянкевічам і выдаў аповесць «5 П — 1 Р». У творах часта выкарыстоўваў беларускія народныя паданні.




**1783** год — французскія вынаходнікі браты Мангальф'е ў сваім родным гарадку Анон запусцілі на вышыню 500 м першы ў свеце цеплавы аэрастат (паветраны шар).

**1941** год — нарадзілася Барбара Брыльска, выдатная польская актрыса кіно. Здымалася ў фільмах «Іронія лёсу, або З лёгкай парай», «Фараон», «Пан Валадыеўскі» і інш. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР.

**1955** год — уступіў у сілу Варшаўскі дагавор аб дружбе, супрацоўніцтве і ўзаемнай дапамозе сацыялістычных краін.

**1981** год — у дакладзе Цэнтра па кантролі за захворваннямі ЗША было апублікавана першае афіцыйнае паведамленне аб так званым сіндроме набытага імунадэфіцыту (СНІД).



**1977** год — у продажы з'явіўся першы персанальны камп'ютар — Apple II.




**БАРЫС АКУНІН:**

*«З усіх асалод, якія падараваны чалавеку, самая вытанчаная — варушыць мазгамі».*

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | — 4.41 | 21.36 | 16.55 |
| Віцебск | — 4.23 | 21.33 | 17.10 |
| Магілёў | — 4.31 | 21.26 | 16.55 |
| Гомель | — 4.37 | 21.13 | 16.36 |
| Гродна | — 4.58 | 21.49 | 16.51 |
| Брэст | — 5.08 | 21.41 | 16.33 |

**Месяц**

***Апошняя квадра 2 чэрвеня. Месяц у сузор'і Авена.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Івана, Міхаіла, Уладзіміра.*
***К.*** *Эмы, Караля, Францішка.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**— Скажыце, вы мне не скажаце?**
**— Ой, вы ведаеце, я нават не ведаю...**

Маленькі Яўген пытаецца:
— Цётка Ніна, а навошта ты ўвесь час малюешся?
— Каб быць прыгожай.
— І праз колькі гадоў гэта дасць эфект?




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
для зваротаў: zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 1512.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 4 чэрвеня 2021 года.